№№41–42
(2561–2562)
15 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

КОРАТКА

Амбасада Венесуэлы адкрылася ў Мінску

Пра гэта журналістам паведаміў Часовы Паверанны ў справах Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Амерыка **Дыяс НУНЬЕС**.

Фінькевіча дапытвае КДБ

Маладзёжнага лідэра Артура Фінькевіча, які адбывае ў Магілёўскай спецкамендатуры пакаранне на "хіміі" за графіці палітычнага зместу, у аўторак прымусова павезлі на допыт у КДБ.

Артур паспеў толькі паведаміць, што яму не патлумачылі прычыну выкліку ў КДБ. Але Фінькевіч лічыць, што яго, як і дзесяткі іншых актывістаў, вырашылі дапытаць напярэдадні вясновых вулічных акцый апазіцыі.

На пачатку сакавіка некалькім актывістам "Маладога фронту" ўжо былі ўручаны пастановы аб тым, што яны з'яўляюцца падазронымі ў крымінальнай справе наконт удзелу ў незарэгістраванай арганізацыі, якую распачаў КДБ.

Павіншуй палітвязня з Днём волі

Актывісты Беларускага Хельсінкскага камітэта з Гродзеншчыны ініцыявалі акцыю "Павіншуй палітвязня з Днём волі". Праваабаронцы заклікаюць падтрымаць ахвяр рэжыму віншавальнымі тэлеграмамі, паштоўкамі і лістамі, а таксама дасылаць у турмы кнігі.

У спісе вязняў, якіх прапануюць падтрымаць гродзенскія праваабаронцы, восем прозвішчаў. Гэта палітыкі Аляксандр Казулін, Мікалай Статкевіч, Павел Севярынец, маладзёжныя актывісты Зміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч, праваабаронца Кацярына Садоўская, лідэры руху прадпрымальнікаў Мікалай Аўтуховіч і Юрый Лявонаў.

Буйны Страхановіч

12 сакавіка ігрок нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе і літоўскага клуба "Каўнас" Алег Страхановіч апынуўся ў эпіцэнтры скандалу. Як паведаміў Сігітас Шукаўскас, дзяжурны Вільнюскага атрада Службы аховы дзяржаўнай мяжы Літоўскай Рэспублікі ў Міцкунай, "Алег Страхановіч у нецвярозым стане штурхаў праваднікоў цягніка, пагражаў... Звярнуліся да нас. Мы знялі яго з цягніка і перадалі ў паліцыю ў выцвярэзнік".

Спадар Шукаўскас таксама паведаміў, што на момант высадкі з цягніка ў крыві Алега Страхановіча было 1,8 праміле алкаголю — гэта прыкладна адпавядае 400 грамам гарэлкі.

SOS!

Чорныя дні цукровай прамысловасці

Трэці тыдзень не працуе Скідзельскі цукровы камбінат. Кіраўніцтва прадпрыемства спадзяецца, што дамова з Расіяй наконт паставак беларускага цукру будзе падпісана да 1 красавіка і гэта зменіць сітуацыю. У аўторак беларуская дэлегацыя накіравалася ў Маскву для чарговых "цукровых" перамоў.

Вытворчасць цукру на камбінаце ў Скідзелі спынена 17 лютага. За апошнія 10 гадоў такога на прадпрыемстве не здаралася.

Ул.інф.

Калі вярстаўся нумар, стала вядома, што спынена вытворчасць на ўсіх цукровых камбінатах Беларусі.

ЛІСТ ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА

Ноч без світання?

Не, займаецца золак...

Каюся, каюся, каюся...

Чаго, чаго я чакаў, чаму, як і абяцаў, не ўзяўся за пяро раней — і сам не ведаю.

Хоць, у прынцыпе, ведаю — разлічваў і нават спадзяваўся на тое, што вось-вось будуць зроблены станоўчыя захады з другога боку.

Але народжаныя поўзаць лятаць не могуць.

Згублены час, а праблема, якая хвалюе нас, журналістаў, а таксама шматлікіх нашых чытачоў, ні на міліметр не скранулася з мёртвай кропкі.

Якая гэта праблема — вам, шаноўныя прыхільнікі "Народнай волі", тлумачыць не трэба. Кожны дзень Вы адчуваеце яе, як кажуць, на ўласнай скуры. Некалі атрымлівалі газету пяць разоў на тыдзень, апошнія паўтара года — па дзве васьмі-палоскі адной адпраўкай.

Які сорам для Беларусі: у XXI стагоддзі "Народная воля", як і некаторыя іншыя недзяржаўныя газеты, вымушана друкавацца па-за межамі роднай краіны!

Духоўны генацыд!

Менавіта гэтыя словы міжволі круцяцца ў галаве, калі праходжу паўз шапікі, у якіх прадаецца нямала рознай *"макулатуры"*, але забаронены гандаль "Народнай воляй".

Узгадваецца сярэднявечнае дзікунства, калі заходзіш на пошту і ў каталогах не знаходзіш "Народнай волі".

Ноч без світання...

Скажаце, не можа такога быць. Гэта пярэчыць законам самой прыроды, а калі падыходзіць з пункту гледжання чалавечага жыцця, то на сучасным этапе цывілізацыі нармальнае развіццё грамадства немагчыма без незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

Тэарэтычна яно так! І я шчыра падзяляю вашы погляды, паважаныя чытачы. Але факт ёсць факт — сёння "Народная воля", вобразна кажучы, выдаецца пад покрывам ночы без світання. Што, што трэба зрабіць, каб як мага хутчэй рассеялася густая цемра?

Той, хто рэгулярна чытае нашу газету, ведае пра звароты да А.Р.Лукашэнкі галоўных рэдактараў пяці недзяржаўных выданняў. Спачатку — у звычайнай пісьмовай форме. Амаль два месяцы чакалі адказу. Дачакаліся. Ад... першага намесніка міністра інфармацыі Л.Ананіч. Вядома ж, нічога абнадзейваючага! Допіс чыноўніцы звёўся да аднаго: маўляў, заключаць ці не заключаць з недзяржаўнымі газетамі дагаворы — справа тых жа друкарняў, прадпрыемстваў "Белсаюздруку", "Белпошты" і г.д. Як быццам невядома, *"пад кім ходзяць"* тыя ж друкарні... Можа, спадарыня Ананіч, скажаце, што яны па ўласнай ініцыятыве скасоўвалі ранейшыя дамовы? Нагадаем, гэта было зроблена пад дыктоўку і імгненна — у адзін дзень, і ледзь не на працягу адной гадзіны.

Палічыўшы адказ Л.Ананіч фармальнай адпіскай (калі не абразай), галоўныя рэдактары пяці недзяржаўных газет вырашылі, што з іх галоў не зваляцца капелюшы, калі яны яшчэ раз звернуцца да А.Лукашэнкі. Але цяпер — у форме **Адкрытага ліста** і праз друк. Ён, Адкрыты ліст, заканчваўся, у прыватнасці, такімі словамі:

"Выступаючы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Вы, Аляксандр Рыгоравіч, заявілі, што маеце намер дэталёва вывучыць сітуацыю і што дадзіце адпаведныя даручэнні з мэтай вырашэння вышэйназванай праблемы. Паколькі нашы спробы заключыць дамовы на друкаванне нашых газет ("Народная воля", "Товарищ", "БДГ. Деловая газета" і інш.) у межах Рэспублікі Беларусь і ўключыць іх у Каталогі перыядычных выданняў на 2007 год, зняць забарону на рэалізацыю часткі тыражоў праз шапікі застаюцца беспаспяховымі, мы спадзяёмся, што іх хуткае выкананне дазволіць разблакіраваць сітуацыю, звязаную з беспадстаўнымі перашкодамі ў дзейнасці нашых выданняў".

Здавалася б, на гэты раз просьба групы галоўных рэдактараў будзе пачута. Можа, яна і пачута, ды толькі аўтарам звароту нічога невядома пра рэакцыю. Хоць, заўважым, з дня адпраўкі апошняга *"рэдактарскага паслання"* А.Р.Лукашэнку мінула больш за чатыры месяцы (!?).

Міжволі падумалася: а раптам мы не мелі рацыі спасылацца на выступленне Аляксандра Рыгоравіча ў Палаце прадстаўнікоў? Можа, ён ні пра які *"намер дэталёва вывучыць сітуацыю"* і даць *"адпаведныя даручэнні з мэтай вырашэння вышэйназванай праблемы"* і не гаварыў? Не, не са столі ўзялася гэтая інфармацыя. Яна пацвярджаецца паведамленнем на сайце агенцтва "Інтэрфакс-Захад". Таго самага агенцтва, якое, не сакрэт, мае цесныя стасункі з "Чырвоным домам". І як тут было не паверыць яго сцвярджэнню: *"Президент Беларуси заявил о своей готовности детально разобраться с ситуацией, которая сложилась с выходом и распространением в республике оппозиционных СМИ"*. Дэталёва разабрацца... Але, бачыце, мінула больш за чатыры месяцы — і ў адказ ні слова.

Стоп, невялікае ўдакладненне. Адказ галоўным рэдактарам усё ж перададзены. Па тэлефоне. Праўда, невядома — ад каго. І наогул — ці можна лічыць гэта адказам?

Справа ў тым, што, як толькі **Адкрыты ліст** А.Р.Лукашэнку быў надрукаваны на старонках газет "Народная воля", "Товарищ", "Витебский курьер", "Борисовские новости", я па даручэнні калег накіраваў спецыяльнае пісьмо кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта Г.Нявыгласу. Вось яго поўны тэкст:

"Паважаны Генадзь Мікалаевіч!

Абставіны прымушаюць патурбаваць Вас у чарговы раз.

Па даручэнні сваіх калег — галоўных рэдактараў недзяржаўных газет звяртаюся з наступнай просьбай. У "Народнай волі", "Борисовских новостях", "Товарище", "Витебском курьере" надрукаваны ***Адкрыты ліст*** *Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнку. У ім тлумачыцца, чаму выкарыстана такая форма звароту.*

Просьба: мы хочам, каб з Вашай дапамогай гэты ***Адкрыты ліст*** *абавязкова трапіў у рукі Аляксандру Рыгоравічу. У любым выпадку праблему трэба вырашаць. Мы будзем чакаць станоўчага адказу.*

І апошняе. Мяне здзіўляе, з якой безадказнасцю некаторыя чыноўнікі ўводзяць Вас у зман. Я знаёмы з Вашым адказам на запыт дэпутата Палаты прадстаўнікоў В.Абрамавай адносна майго звароту да яе. Вы пішаце, што Міністэрства інфармацыі яшчэ 2 кастрычніка 2006 года праінфармавала мяне аб тым, што на "основании Гражданского кодекса Республики Беларусь граждане и юридические лица свободны в заключении договора". Не буду каментаваць сутнасць гэтага сцвярджэння, але мяне абурае ***хлусня.*** *Ніхто мяне наогул не інфармаваў наконт адказу на наш ліст. Толькі 12 кастрычніка, пасля размовы з А.Слабадчуком* (тагачасным першым намеснікам начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта. — **Аўт.**), *я звязаўся з Міністэрствам інфармацыі і з цяжкасцямі даведаўся, што такі адказ ёсць. Нічога не ведалі і мае калегі. А Вам чыноўнікі проста схлусілі, што спадару Сярэдзічу ўсё патлумачана.*

Генадзь Мікалаевіч! Я не бязгрэшны, але галоўная рыса майго характару — шчырасць. Хацелася б, каб так ставіліся і да мяне. А таму сапраўды разлічваю на Вашу дапамогу".

Святая наіўнасць! "Разлічваю на Вашу дапамогу..." Зноў мінаў тыдзень за тыднем, а ад спадара Нявыгласа, як і ад спадара Лукашэнкі, ніякіх вестак. І тады я схапіўся за тэлефонную трубку. Цвёрда вырашыў трапіць на афіцыйны прыём.

— Генадзь Мікалаевіч, ну знайдзіце, калі ласка, пяць хвілінак...

— Вось пройдзе саміт, з'езджу ў Кіеў — пасля гэтага і патэлефануйце...

Неаднойчы я яшчэ звязваўся па тэлефоне з Г.М.Нявыгласам. Але кожны раз сустрэча пераносілася. І раптам... У тэлефоннай трубцы голас таго самага Аляксандра Іванавіча Слабадчука:

— Іосіф Паўлавіч, Вы не маглі б перадаць па факсе пытанні, якія хацелі б разглядзець падчас сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта...

— Дык яны ў лісце...

— Не, усё ж сфармулюйце па-новаму, і я чакаю...

Страшэнна не люблю марнаваць час, але вымушаны быў сесці і напісаць:

"Першаму намесніку начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сп.СЛАБАДЧУКУ А.І.

Інфармую Вас, што падчас магчымай сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сп.Нявыгласам Г.М. я хацеў бы атрымаць адказы на наступныя пытанні:

1.Ці можа Генадзь Мікалаевіч пацвердзіць, што з ***Адкрытым лістом*** *галоўных рэдактараў недзяржаўных газет "Народная воля", "Борисовские новости", "Товарищ", "Витебский курьер", "БДГ. Деловая газета" азнаёміўся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь сп.Лукашэнка А.Р.? Дарэчы,* ***Адкрыты ліст*** *яшчэ ў кастрычніку быў надрукаваны ва ўсіх газетах, акрамя "БДГ. Деловая газета", выданне якой спынена.*

2.Ці азнаёміўся Генадзь Мікалаевіч з лістом, які я ад імя калег-рэдактараў накіраваў на яго імя яшчэ 25.10.2006 года і ў якім прасіў давесці ***Адкрыты ліст*** *да Прэзідэнта А.Р.Лукашэнкі, калі ён па нейкіх прычынах яшчэ не азнаёміўся з ім?*

3.Ці будуць у бліжэйшы час станоўча вырашаны наступныя пытанні:

а) тыражаванне газет "Народная воля", "Товарищ" у друкарнях Мінска (зараз яны вымушаны друкавацца ў Смаленску);

б) вяртанне ўсіх пералічаных вышэй газет (п.1) у Каталогі "Белпошты", "Белсаюздруку" і распаўсюджванне іх праз адпаведныя экспедыцыі;

в) вяртанне выданняў у кіёскі "Белсаюздруку" і паштовыя аддзяленні;

г) спыненне дыскрымінацыі недзяржаўных газет, рэдактары якіх звярнуліся да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з боку Міністэрства інфармацыі?"

Літаральна праз дзень-другі — званок. На гэты раз спадар Слабадчук, якога я ведаю яшчэ з тых часоў, калі ён шчыраваў у КДБ, не стаў падбіраць словы. Як з аўтамата выпаліў:

— Шчыльны графік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта не дазваляе прыняць Вас у бліжэйшы час, звяртайцеся ў міністэрства...

Прызнаюся, я катэгарычна спыніў тыраду спадара Слабадчука:

— Ведаеце, па кругу ходзяць толькі ў вар'яцкім доме... У "Народнай волі", дзякуй Богу, працуюць нармальныя людзі.

Сапраўды, колькі ж можна вадзіць за нос, пераліваць з пустога ў парожняе?! Чытачы памятаюць мае шматлікія дыялогі з міністрам інфармацыі сп.Русакевічам. Да скону дзён у вушах будуць гучаць яго здзеклівыя словы:

"Предприятия Министерства информации с "Народной волей" работать не будут".

Я не маю намеру больш тэлефанаваць і спадару Нявыгласу. Мне, як і маім калегам, усё даўно зразумела: у нашай краіне кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта, як і любы міністр, нічога не вырашае.

У нашай краіне вырашае адзін чалавек. Ну, можа, яшчэ два-тры. Тыя, хто, як кажуць, бліжэй за ўсіх *"да цела"* самага-самага Галоўнага.

Генадзь Мікалаевіч, Вы задаволены такой сітуацыяй?

А Вы, Уладзімір Васільевіч?

А Вы, Аляксандр Іванавіч?

А Вы, Лілія Станіславаўна?

Чалавек без правоў — раб. А ў рабоў і дзеці будуць рабамі. Такое будучае Вы рыхтуеце сваім нашчадкам?

Лёс "Народнай волі" хвалюе не толькі нас, журналістаў. З усіх куткоў Беларусі ідуць лісты са словамі падтрымкі, парадамі. Вось што напісаў нам сталы чытач з Мазыра Аркадзь Аляксандравіч Шумак:

"И.Середич! Подавайте на Лукашенко в суд за издевательство и диктатуру!..

Сколько можно издеваться над подписчиками?!

Почта должна служить всем! всем! всем!.."

Дарагі Аркадзь Аляксандравіч! На жаль, мы не маем магчымасці скарыстацца вашай парадай. Каб *"почта служила всем! всем! всем!"*, людзі ў мантыях павінны служыць Яго Вялікасці Закону. А ў нас...

Зноў — ноч без світання? Не, ужо бачны золак. Вось-вось займецца на світанак. А за ім ясны, сонечны дзень.

Не будзем падаць духам, сябры!

Разам мы хутчэй наблізім радасны Дзень! Толькі пастарайцеся, даражэнькія, каб у другім квартале 2007 года нас было болей.

Не ведае пра "Народную волю" таварыш па працы — дайце нумар-другі пачытаць, парайце зрабіць перадаплату...

Пустая паштовая скрынка ў суседа — пагаварыце шчыра, патлумачце, што ў Беларусі, на жаль, не шмат газет, якія, як "Народная воля", пішуць праўду.

У сябра дзень нараджэння — падарыце аплачаную паштовую картачку...

Адным словам,

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар газеты "Народная воля".

P.S. *Як вядома, нядаўна А.Лукашэнка прызначыў А.Слабадчука намеснікам міністра інфармацыі...*



ПЕРАМОВЫ

Ута Цапф збірае беларусаў і расіян

15 сакавіка ў "Алмазе", як празвалі новую Нацыянальную бібліятэку ў народзе, рабочая група па Беларусі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы на чале з немкай Утай Цапф збірае беларускіх і расійскіх дэпутатаў.

Бакі маюць абмеркаваць праблему супрацоўніцтва Еўрасаюза з Беларуссю ў рамках праграмы добрасуседства. Але "нейтральная назва" не павінна нікога ўвесці ў зман: на самай справе будзе першае мерапрыемства, з дапамогай якога еўрапейскія краіны спрабуюць уцягнуць Аляксандра Лукашэнку ў дыялог з апазіцыяй. Каб ініцыятыва нікога не палохала, запрошаны і прадстаўнікі Расіі. Дакладней, прадстаўнікі Дзяржаўнай Думы. Дэлегацыя Нацыянальнага сходу наступная: Анатоль Красуцкі і Сяргей Забалоцец — ад Палаты прадстаўнікоў, Наталля Андрэйчанка — ад Савета Рэспублікі.

Ад "апазіцыянераў" на форум запрошаны былы старшыня Савета Рэспублікі Аляксандр Вайтовіч і старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі Уладзімір Колас. Ніводзін лідэр партый дэмакратычнага накірунку на сустрэчы прысутнічаць не будзе. Ці не такім жа будзе і дыялог?..

Георгій ГЛЕБУСЬ.

«Если бы мне пришлось решать, что лучше, иметь правительство без газет или газеты без правительства, я, не колеблясь, выбрал бы последнее».

Томас ДЖЕФФЕРСОН, 1787 г.

ТАМ, ЗА КРАТАМІ

Казуліну пагражаюць расправай?

Напярэдадні свята 8 Сакавіка на шэраг інтэрнет-сайтаў прыйшоў ліст, падпісаны "Патрыёты Беларусі, супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі", у якім сцвярджалася, што супраць экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна рыхтуюцца правакацыі.

"У адносінах да А.Казуліна, — сцвярджалася ў электронным паведамленні, — *рыхтуюцца новыя правакацыі ў турме, а менавіта, будзе спланавана бытавая спрэчка паміж асуджанымі, падчас якой будуць нанесены цялесныя пашкоджанні А.Казуліну. Да канца вясны стан А.Казуліна можа значна пагоршыцца, таму што гэтаму будзе папярэднічаць пападанне атруты ў ежу. Усім зразумела, што ў выпадку змянення сітуацыі А.Казулін будзе рэальна прэтэндаваць на пост прэзідэнта, калі, канечне, застанецца здаровым чалавекам. А.Лукашэнка разумее, што свае галадоўкай А.Казулін заслужыў вялікі аўтарытэт сярод наменклатурных і сілавых структур. Справа А.Казуліна пад асабістым кантролем В.Лукашэнкі. Менавіта яму ў першую чаргу дакладваюць аб стане здароўя, сувязях у калоніі, аб сустрэчах з роднымі і г.д. Уся праца супраць А.Казуліна спланавана менавіта Віктарам Лукашэнкам".*

Адвакат Казуліна Ігар Рынкевіч паспрабаваў высветліць, наколькі небяспечна знаходжанне яго падабароннага ў калоніі, і звярнуўся з адпаведным пытаннем да намесніка начальніка па рэжыме Руслану Прыймаку. Справа ў тым, што адразу пасля з'яўлення ў Інтэрнеце ліста, за подпісам "патрыёты Беларусі", І.Рынкевіч выехаў у калонію "Віцьба-3" на спатканне з экскандыдатам у прэзідэнты А.Казуліным.

— Намеснік начальніка калоніі Руслан Прыймак запэўніў, што падстаў хваляваццa за жыццё і здароўе Казуліна няма, таму што адміністрацыя нясе адказнасць за кожнага асуджанага, — расказаў "Народнай волі" Ігар Рынкевіч. — Тым не менш на імя начальніка ўстановы я накіраваў ліст з пытаннем, ці звяртаўся Казулін з якой-небудзь заявай аб канфліктах, якія ўзнікаюць сярод асуджаных, з яго ўдзелам, а таксама ці паступалі адпаведныя звароты-прэтэнзіі ад гэтых асуджаных. Таксама ў сувязі са з'яўленнем электроннага паведамлення я спытаўся, наколькі рэальна паўстае пагроза бытавых канфліктаў з удзелам Казуліна.

Я паведаміў і свайму падабароннаму аб існаванні гэтага ліста. Казулін сказаў, што да гэтага часу ніякіх бытавых канфліктаў з іншымі асуджанымі ў яго ніколі не ўзнікала. Аднак апошнім часам у пакой жыллёвага корпуса, дзе месціцца Аляксандр Уладзіслававіч, актыўна падсяляюць новых асуджаных. Пакой мае памер 30 квадратных метраў, а ў ім ужо знаходзіцца 22 ложка/месца. Пры тым што норма — 2,5 квадратнага метра на чалавека. Ложкі размяшчаюць у два ярусы. Казулін звярнуў увагу на тое, што ягонаму атраду належаць тры корпусы, і ў адным з іх, напрыклад, і па сёння захоўваецца тая ж колькасць асуджаных, якая была і раней, нормы пражывання не парушаюцца. Акрамя таго, Аляксандр Уладзіслававіч адзначыў, што, на яго думку, новыя "пастаяльцы" корпуса паводзяць сябе неадэкватна. І таму Казулін не выключае, што інфармацыя аб магчымых правакацыях у дачыненні да яго небеспадстаўная.

— А як сябе адчувае Аляксандр Уладзіслававіч?

— Высветлілася, што ў адносінах да Казуліна адменены рэжым выхаду з галадоўкі. Гэта азначае, што харчавацца цяпер Аляксандр Уладзіслававіч мусіць у сталоўцы, родным забаронена перадаваць яму прадукты. Казулін пераведзены на дыетычнае харчаванне, мае стол 5В з бедным меню. Адзіная прывілея, калі так можна сказаць, якая засталася — Казулін вызвалены ад працы. У астатнім ніякіх абмежаванняў ён не мае і абавязаны наведваць усе ўнутраныя мерапрыемствы.

Я намагаўся высветліць, на якой падставе быў зменены рэжым харчавання майго падабароннага, ці ёсць нейкае медыцынскае заключэнне, якое б фіксавала, што Казулін адчувае сябе лепш менавіта па медыцынскіх паказчыках. Аднак канкрэтнага адказу з боку адміністрацыі калоніі не прагучала, і я быў вымушаны зрабіць адвакацкі запыт.

Сам Казулін знешне выглядае крыху лепш. Але вагу набірае вельмі марудна, перыядычна яго турбуюць болі ў пазваночніку, кішачныя колікі. Аднак настрой у яго добры, аптымістычны.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 САКАВІКА 2007 г.

ЗАДУМАЕМСЯ...

Авторитаризм и справедливость

Самое страшное зло — то, что прикидывается благом

В недавно опубликованном в “Народной воле” открытом письме президенту Республики Беларусь А.Г.Лукашенко ветеран-афганец Александр Комаровский призывает правителя *“руководствоваться принципами справедливости ко всем”* гражданам.

Обращает внимание: в обществе все больше говорят о несправедливости со стороны органов власти, чиновников. Подтверждает сей факт и последняя директива главы государства.

Однако, на мой взгляд, проблема глубже. Причина в самой сущности нынешнего режима.

Итак, что такое авторитаризм? Это, по сути, единовластие, антидемократическая система государственной власти. Как правило, включает в себя элементы личной диктатуры. Авторитаризма у нас хватает, — признал и Александр Лукашенко.

Что такое справедливость? Еще древние философы (Платон) рассматривали ее как **добродетель.** Суть в том, чтобы быть справедливым по отношению к людям, уважать их, их права и свободы. Справедливость содержит и требование соответствия между правами и обязанностями, между трудом и вознаграждением, между преступлением и наказанием и т.п. Любое отклонение рассматривается как **несправедливость.** Именно исходя из этого принципа целесообразно оценивать поведение, действия как отдельной личности, общественно-политической организации, так и властных структур.

В Основном законе — Конституции — Беларусь объявлена демократическим социальным правовым государством. Рассмотрим вкратце, насколько соответствует данная декларация на практике понятию справедливость.

Дозированная демократия

Демократия, как известно, есть форма государственного устройства, основанная на признании народа источником власти, его права участвовать в решении государственных дел. При этом гарантируются широкие права и свободы граждан, естественно, регламентируются и их обязанности. Такой набор декларируется и в Конституции Беларуси. Следовательно, **формальную** демократию мы имеем. Неслучайно звучали заявления представителей власти: дескать, у нас демократии не меньше, чем в развитых странах. Правда, в последнее время оценки скромнее: у нас, оказывается, некая суверенная, **регулируемая** демократия. Только один человек — глава государства — знает и решает, в каких дозах, как лекарство, ее может принимать общество. Обратим внимание: не Конституция определяет, а одна личность!

И что же в реальности? Важнейшей составляющей демократического устройства государства являются выборы. Спрашивается: выборы президента, депутатов у нас свободные, справедливые? Чтобы ответить на этот вопрос, следует обратить внимание на такой нюанс. У нас лишь госорганы реально контролируют все стадии избирательного процесса. Налажен тщательный отбор состава избирательных комиссий и кандидатов в депутаты. Основной критерий — лояльность к режиму.

Правда, приводится такой аргумент. Никто, мол, не мешает гражданам голосовать, как они хотят, но... Во-первых, разве не задействованы в пользу только сторонников власти официальная *“умиротворяющая”* пропаганда, административный ресурс? Во-вторых, разве объективно проводится подсчет голосов? О фальсификациях заявляли не**** не только независимые социологи. Недавно своеобразно подтвердил сей факт и сам президент. Дожили...

Можно сколько угодно проводить народных “вече”, съездов из “отсорбированных” сторонников, принимать заранее подготовленные резолюции. Вот только реальной демократии в обществе не прибудет, а значит, и справедливости.

Формализм, бюрократизм, взятки — спутники авторитарного режима. Они его порождение и его же... “червоточники”.

В обществе стало больше жестокости и насилия, хамства и равнодушия, эгоизма, а нравственности меньше. Авторитаризм, тотальный контроль над обществом несправедливы в сущности своей.

Государство против... человека

Выдвинут неплохой тезис: государство для народа. И вроде бы госбюджет социальной направленности. Налицо экономический рост, правда, во многом благодаря поставкам российских газа и нефти. Как следствие, определенный подъем жизненного уровня населения.

Однако все ли так благостно? Приведем примеры. Во времена СССР (исключая страны Балтии), Беларусь занимала второе место по размеру зарплат после России. Теперь же в СНГ она уступила и Казахстану. Усиливается разрыв между доходами различных групп населения, между богатыми и бедными. Половина работающих имеют зарплату примерно полторы тысячи рублей в час. Нетрудно убедиться, как им живется, учитывая постоянно растущие цены на товары и продукты, тарифы ЖКХ. Кстати, явно снижается интерес, мотивация к труду. Не случайны в последнее время стихийные выступления рабочих против низких зарплат на ряде предприятий. Сократилось, и значительно, финансирование путевок в госсанатории. А чтобы судить о “бесплатном” лечении, достаточно побывать на приеме в рядовой поликлинике.

Наиболее сложно складывается ситуация с жильем. Его строится явно недостаточно, особенно социального. Причем меньше, чем в 1990-х годах. Парадокс на фоне строительства престижных объектов не первой необходимости!

Стоимость жилплощади резко возросла. Она более чем в три раза превышает экономически обоснованный норматив, который предусматривает, что цена одного кв. метра равна среднемесячной зарплате.

Экономисты подсчитали: примерно 90% нуждающихся не смогут за всю жизнь заработать на квартиру. О какой же справедливости идет речь?!

Когда обижен каждый третий...

Пожалуй, основные претензии населения вызваны именно **несправедливостью власти.** Согласно социологическим опросам, по этой причине обижен каждый третий гражданин. Примечательно в этой связи недавнее откровение депутата, известного своей ортодоксальной пропрезидентской позицией. Оказывается, в народном государстве гражданин не может отстаивать свои права. А когда он начинает их отстаивать, то его за это еще “мурыжат и душат”. Прозрели! Впору бы и руководству страны задуматься.

А как соотнести с понятием “правовое государство” преследование оппонентов власти (пример тому осуждение Александра Козулина и других политиков); давление на оппозиционные СМИ, политические партии, общественные организации, независимые профсоюзы; дискриминационное отношение к белорусскому языку и культуре; насаждение в обществе единой государственной идеологии?

Вызывает обоснованное недовольство работников контрактная система найма, которая все больше используется для расправы и инакомыслящими, неугодными. Напомним, массовый перевод всех работающих на контракты начался в 2003—2004 годах. Готовился референдум по изменению Конституции страны в интересах действующего президента.

Кстати, тогда и Федерация профсоюзов заявляла о своем несогласии с применением в массовом порядке подобной формы трудовых отношений, но дальнейшие действия уже нового руководства ФПБ свелись к... информированию главы государства о сложившейся ситуации, о повсеместных нарушениях при переводе работников на контракт... Как будто не президент инициировал и насаждал эту порочную систему!

В нашем *“правовом”* государстве все откровеннее декларируется явно неправовой принцип — лояльность, личная преданность. Не секрет, продвижение по службе, личное благосостояние во многом зависят от близости к власть имущим. А теперь и уголовная ответственность крупных чиновников будет определяться с согласия президента. Вот вам и конституционное равенство прав граждан.

Справедливость — не абстрактное понятие. Это то, что и должно быть, без преувеличения в основе государственного строя, жизненного уклада. Жизненно важно, чтобы власть была справедливой! Несправедливость как ржавчина разъедает государство и общество, души людей. Задумаемся: кому это выгодно?

***

Вывод! Нам всем надо преодолевать страх, не мириться с несправедливостью и на госуровне, и в быту. Учиться защищать свои права: политические, трудовые, социальные. Бороться за них организованно, проявляя гражданскую солидарность, поддерживать деятельность демократических и общественных организаций, профессиональных союзов. Бороться за справедливую жизнь, за справедливую Беларусь!

Владимир ГОНЧАРИК,
экс-кандидат в президенты Республики Беларусь.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Моладзь пужаюць крыміналам

12 сакавіка актывістку незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт” вучаніцу СШ №70 Мінска Насцю Палажанка выклікалі ў пракуратуру Мінска па крымінальнай справе, узбуджанай па артыкуле 193 частцы 1 Крымінальнага кодэкса — дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Сябар дзяўчыны Артур Фінькевіч паведаміў “Народнай волі”, што са сведкі Насця Палажанка пераўтварылася ў падазроную.

Крымінальная справа па факце дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі ўзбуджана 4 лютага УКДБ па Мінску і Мінскай вобласці. Асноўнымі фігурантамі дасюль былі маладзёжныя актывісты Дзмітрый Федарук і Алег Корбан. 18-гадовы Дз.Федарук і 22-гадовы А.Корбан пасля затрымання 4 лютага на прыватнай кватэры ў Мінску трое сутак правялі ў следчым ізалятары КДБ, пасля чаго былі адпушчаны на волю пад падпіску аб нявыездзе.

16-гадовая Насця Палажанка спачатку праходзіла па справе як сведка, аднак 12 сакавіка дзяўчыну “перакваліфікавалі” ў падазроную. Артур Фінькевіч кажа, што санкцыі артыкула 193 не прадугледжваюць змяшчэнне падазроных у СІЗА. Тым не менш непаўналетняя вучаніца фізіка-матэматычнага ліцэйскага класа СШ №70 патрапіла ў надзвычайнае становішча: кіраўніцтва школы ўжо папярэджвала дзяўчыну пра магчымае выключэнне з класа, а магчыма, і са школы.

Артур Фінькевіч паведаміў “НВ”, што 11, 12, 13 сакавіка пракуратура “ў масавым парадку” выклікала сведкаў і падазроных. Калі сказаць прасцей, маладафронтаўцаў арганізавана цягаюць на допыты. 11 сакавіка на ноч гледзячы ў кватэру Дзмітрыя Федарука спрабавалі ўварвацца супрацоўнікі КДБ. Прэс-служба МФ паведамляе, што спачатку сілавікі доўгі час не маглі ўвайсці нават у пад’езд гмаху, дзе жыве хлопец, аднак, патэлефанаваўшы суседзям, усё-ткі прарваліся. Шукалі Дзмітрыя Федарука. *“Пасля гэтага прадстаўнікі спецслужб зрабілі некалькі нахабных спроб, ужываючы розныя сродкі, увайсці ў кватэру маладафронтаўца, даволі доўгі час проста спрабавалі зламаць дзверы, аднак, не атрымаўшы вынікаў, вымушаны былі сысці”,* — паведамілі ў прэс-службе.

Арганізацыя перакананая: гэтыя дзеянні спецслужб звязаны з акцыяй 25 сакавіка — Днём Волі.

Рэжым спрабуе ўсімі магчымымі сродкамі блакіраваць і зрабіць так, каб маладафронтаўскія вулічныя лідэры не патрапілі на святкаванне Дня свабоднай Беларусі.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

СТОЛИЦА

В районе Октябрьской площади появится пятизвездочный отель

В Минске крупная строительная арабская компания намерена возвести пятизвездочный отель. Об этом в интервью корреспонденту БЕЛТА сообщил председатель Мингорисполкома Михаил Павлов.

По его словам, соответствующая договоренность достигнута по итогам переговоров, состоявшихся в ходе визита официальной делегации Беларуси в Объединенные Арабские Эмираты. Возведение отеля станет первым проектом в сотрудничестве Минска и ОАЭ. *“С этой целью в ходе визита я ознакомился с объектами, которые финансирует арабская компания, изъявившая желание строить в Минске пятизвездочный отель”,* — сказал Михаил Павлов.

К настоящему времени эскизный проект объекта уже прошел стадию согласования. “Это будет отель очень высокого уровня. Сегодня в Минске таких гостиниц нет”, — подчеркнул председатель Мингорисполкома.

Согласно достигнутым договоренностям, строительство отеля арабская сторона начнет в нынешнем году. А завершить работы планируется за два года. Право эксплуатации отеля будет принадлежать данной компании. Предполагается, что современный объект сервиса появится в районе Октябрьской площади, добавил Михаил Павлов.

СТАЛІЦА

Ці будзе ў Мінску вуліца Напалеона Орды?

У Мінску, магчыма, з’явіцца вуліца Напалеона Орды, вядомага беларускага мастака, кампазітара і пісьменніка XIX стагоддзя.

Мінгарвыканкам павінен разгледзець пытанне надання яго імя адной з вуліц сталіцы да канца сакавіка. Нагадаем, у лютым з гэтай ініцыятывай выступіла Таварыства беларускай мовы. Сёлета ў краіне адзначаліся 200-я ўгодкі з дня нараджэння Напалеона Орды.

Алег СНОЎ.

НУ І НУ!

Дык хто тут пад «наркатычнымі парамі»?

Законапаслухмянаму мінчаніну П. (назавём яго так) паведамілі днямі, што яго ні за што ні пра што паставілі на ўлік у наркалагічны дыспансер.

— Напрыканцы лютага маёй маці патэлефанавалі дадому, — расказвае абураны суразмоўца. — Урач Рамашка з наркалагічнага дыспансера паведаміла ёй, што я пастаўлены на ўлік у наркалагічным дыспансеры Ленінскага раёна, і мне неабходна з’явіцца па адрасе: г.Мінск, вул. Маякоўскага, 162 у кабінет №12 з флюараграфіяй. Маці адправілася туды, бо думала, што адбылося непаразуменне, аднак на месцы высветлілася, што ў адносінах да мяне на самай справе заведзена медыцынская картка. Акрамя гэтага я з жахам даведаўся, што 18 студзеня 2007 года мяне быццам бы затрымалі супрацоўнікі ГАМ №1 Ленінскага раёна за здзяйсненне адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных арт.156, 166 КоАП Рэспублікі Беларусь. Правапарушэнні былі здзейснены ў нецвярозым выглядзе, быў быццам бы праведзены мой медыцынскі агляд. Калі маці захацела высветліць, як жа мяне, ні ў чым не павіннага, паставілі на ўлік, ёй цынічна адказалі, што, маўляў, “нічога страшнага няма, пастаіць некалькі месяцаў на ўліку, а пасля мы яго здымем”. Дарэчы, у аддзеле міліцыі, куды мы таксама звярнуліся, ніякіх даных на мяне не аказалася.

Гісторыя наколькі смешная, настолькі і сумная, у якой узнікае вельмі шмат пытанняў. На якой падставе была заведзена медыцынская карта, калі ніякіх адміністрацыйных пратаколаў у міліцыі няма? Чый медыцынскі агляд быў зроблены замест грамадзяніна П. і ці быў ён наогул?

Дарэчы, пасля таго, як П. звярнуўся са скаргамі да міністра аховы здароўя, галоўнага ўрача УЗ “Гарадскі наркалагічны дычпансер” і заявай аб узбуджэнні крымінальнай справы ў Пракуратуру Ленінскага раёна, з Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера яму прыйшоў адказ, які мы цытуем без аніякіх стылістычных і арфаграфічных правак: *“Паважаны П.! На Вашу заяву ў адрас галоўнага ўрача УЗ ”Гарадскі наркалагічны дыспансер" паведамляе наступнае. П. на ўліку ў наркалагічным дыспансеры не стаіць, і ніколі не стаяў раней. Вашы пашпартныя даныя, якія супадаюць з пашпартнымі данымі грамадзяніна В., узяты з пратакола, прад’яўленага 18.01.200г. супрацоўнікам ГАМ-1 Ленінскага РУУС г.Мінска фельдшару наркалагічнага дыспансера”.*

Вось такая цікавая гісторыя! У якім годзе затрымалі таго грамадзяніна, так і не ўдалося высветліць, а як пашпартныя даныя аднаго чалавека могуць супасці з пашпартнымі данымі другога (маці, дарэчы, у наркалагічным дыспансеры нават паведамілі, дзе яе сын працуе) — гэта, як кажуць, не для сярэдняга розуму. Аднак нават і з сярэднім розумам можна было б дадумацца, каб прынесці чалавеку элементарныя прабачэнні.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

КВАРТИРНЫЙ ВОПРОС

Как три семьи зиму в «землянке» пережили

Всю зиму три семьи прожили в общежитии минского ОАО “Камволь” без воды, газа, электричества и отопления

— Помогите! — зазвучал в телефонной трубке голос отчаяния. — Живем без света, газа, воды, отопления, при свечах... Зимой в комнатах спали при минус 10. Еще и теперь в комнатах минусовая температура, приезжайте...

Общежитие №2 на ул.Солнечной, которое находится в ведомстве ОАО “Камволь”, — типичная пятиэтажка. В здании, когда на улице уже плюсовая температура, по-прежнему — минус. Это настолько промерзли стены! На входе — бабушка-вахтер, хотя в здании живут всего три семьи.

— Я на камвольном проработала в общей сложности 23 года, — чуть ли не со слезами на глазах вводит меня в курс дел Тамара Воронкевич. — Уволилась не по своему желанию, просто наш детсад был переведен в ведомство Управления образования администрации Ленинского района. С 86-го года стояла на камвольном в очереди на улучшение жилищных условий, но в 2003-м (в то время я еще находилась в очереди) предприятие получило разрешение Мингорисполкома на создание в этом общежитии ЖСК — его собрались реконструировать и построить квартиры. А через месяц меня сняли с очереди. По закону мне должны были сообщить об этом в десятидневный срок, но я вообще узнала об этом случайно.



Замерзшая в ведре вода в комнате не тает даже теперь.

В конце прошлого года ветерану труда и матери двоих несовершеннолетних детей Тамаре Ивановне предложили-таки новое жилье — в другом общежитии.

— Комната не соответствовала санитарным нормам, положенная жилая площадь — тоже, — продолжает Тамара Ивановна. — Выбора не дали никакого. Просто пришло уведомление — иди и живи. Там общежитие старше этого. Одна душевая на всех, на кухне — 25 семей на 2 плиты — туда не пробиться вечером. Я с этим не согласилась и осталась в общежитии.

Тамара Ивановна не одинока в своем порыве. Кроме нее в общежитии осталась Валентина Алексеевна Царапкина. Она детдомовка, воспитывалась в России, сейчас живет с несовершеннолетней дочерью Алиной. Третья — Ольга Ивановна Скороход, работает на камвольном, имеет много разных заслуг, поощрений. И тоже не согласна на те жилищные условия, которые ей предложили.

“23 октября прошлого года нам отключили горячую воду, — рассказывает моя собеседница. — 26 октября — газ, 8 ноября — холодную воду, а 9 ноября — электричество. Решение принял камвольный комбинат, хотя здесь оставались три семьи, которые не были согласны с новыми условиями. И с октября у нас продолжаются судебные тяжбы. Я требовала в суде, чтобы были привлечены органы опеки и попечительства, чтобы проверили предлагаемое мне жилье. Первая инстанция в Ленинском суде этому не придала особого значения, но прокурор Ленинского района потребовал решение суда отменить и дело направить на новое рассмотрение в тот же суд. И вот — окончательного решения суда еще нет, а мы так и продолжаем жить, как дикари”.

Ольга Скороход и Тамара Воронкевич спят только с горячими канистрами.

Пришло утешительное письмо “отщепенцам” и из Беллегпрома: “Временные трудности, связанные с реконструкцией общежития, вам необходимо понять, и концерн ”Беллегпром" предлагает вам добровольно их принять".

— Как так получилось? — обратился корреспондент “Народной воли” к заместителю генерального директора ОАО “Камволь” Елене ПЛИСКОВОЙ.

— Понимаете, эти люди сами себе создали такие условия и не хотят переселяться в благоустроенные комнаты, — говорит она. — Они хотят получить бесплатное жилье.

— Но ведь решения суда еще нет...

— На уровне районного суда есть решение переселить все три семьи в другие подведомственные нам общежития. Сейчас санстанция провела обследование этих комнат, которые им предлагаются и, насколько мне известно, вынесла решение, что они пригодны для проживания. Там отремонтированные, чистые комнаты, метраж соответствует... Они хотят бесплатное жилье, но сегодня бесплатный сыр — только в мышеловке.

...Как бы там ни было, но пока решения суда еще не было, а три семьи по-прежнему остаются на “баррикадах”, с ужасом вспоминают зимние морозы, когда спать приходилось в одежде и носках из собачьей шерсти и с радостью говорят о приходе весны. А вот будет ли “потепление” в решении квартирного вопроса — об этом им пока что неизвестно.

Алесь СИВЫЙ.
Фото автора.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 САКАВІКА 2007 г.

КУЛУАРЫ

На дзяржслужбу будуць браць толькі па рэкамендацыі іншых службоўцаў

Урад разаслаў па мясцовых выканкамах загад, падпісаны прэм'ер-міністрам краіны **Сяргеем Сідорскім**, паводле якога на дзяржаўную працу будуць прымаць толькі пасля прад'яўлення рэкамендацый ад двух службоўцаў, якія ўжо працуюць на дзяржслужбе.

Таксама стала вядома, што службоўцы, якія паручыліся за тых, хто паступае на працу, будуць несці асабістую адказнасць за рэкамендаваных, паведамляе інтэрнет-выданне "Ежедневник". Раней кіраўніцтва Беларусі ўжо прымала меры па кантролі за працай прэзідэнцкай вертыкалі, але, трэба разумець, яны аказаліся не досыць эфектыўнымі. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, прэзідэнцкая вертыкаль — *"гэта дзяржаўныя органы ўлады, гэта больш, чым ваенная структура, і ўсё павінна быць выразна і зразумела"*.

Алег СНОЎ.

SOS!

Зварот

управы Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў да грамадзян Рэспублікі Беларусь, настаўнікаў, літаратуразнаўцаў, бацькоў беларускіх школьнікаў

Як нам стала вядома, **рыхтуецца маштабнае "ідэалагічнае" перапісванне школьных праграм па беларускай літаратуры.** Стылістыка некаторых дакументаў сведчыць: на Беларусь вяртаюцца змрочныя часы, калі ап'янелыя ад рэвалюцыйных падзей дзяржаўныя чыноўнікі па-вар'яцку змагаліся з нацыянальнай літаратурай, у выніку чаго ў 20—30-х гадах мінулага стагоддзя былі рэпрэсаваныя сотні беларускіх пісьменнікаў, а іх творы на дзесяцігоддзі забараняліся.

У наш час пасля гвалтоўнай пераробкі "Праграмы па гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя: Для студэнтаў філалагічнага факультэта" (БДУ, 2003) сталічныя ідэолагі прыняліся за праграмы школьныя. Нашчадкам сумнавядомага Бэндэ, да прыкладу, не падабаецца базісная аснова беларускай літаратуры XX стагоддзя — яе адраджэнцкі пафас, і яны сваімі распараджэннямі загадваюць (цытуем у мове дакумента) *"пераформулировать ... содержание раздела V "Літаратура нацыянальнага адраджэння" в программе для 11 класса"*.

Ідэалагічныя чыноўнікі Беларусі даходзяць да найвышэйшай ступені ганебнасці і фарысейства, калі ў юбілейны год нацыянальнага генія Янкі Купалы імкнуцца забараніць некаторыя ягоныя творы, у прыватнасці — п'есу "Тутэйшыя", забараняюць для вывучэння (а праз тое — і публікавання) аповесць Васіля Быкава "Аблава".

Сучасныя герастраты ў сваіх "распарадзілаўках" патрабуюць ад складальнікаў новых школьных праграм *"предельно минимизировать использование оппозиционно настроенных писателей ... Н.Гилевича, Р.Бородулина, Г.Буравкина и других", "исключить из списков литературы для изучения и внеклассного чтения произведения С.Алексиевич, С.Законникова, О.Ипатовой, В.Орлова, М.Скоблы, В.Чаропки и иных оппозиционно настроенных писателей", а "проекты программ обязательно согласовывать с Союзом писателей Беларуси и представить доработанные проекты программ с визой Н.И.Чергинца 1 марта 2007 г."*.

У новых праграмах загадваецца *"обязательно упомянуть о создании Союза писателей Беларуси и его роли в ... развитии (!) литературы"*. Гэтым Саюзам, створаным усяго год таму, дзяржаўныя ўлады намагаюцца замяніць наш Саюз Купалы, Коласа, Броўкі, Танка, Караткевіча, Мележа, Быкава, Брыля, Шамякіна, Навуменкі.

Паважаныя грамадзяне Беларусі! Ад імя найстарэйшай і цяпер апальнай творчай арганізацыі Беларусі — Саюза беларускіх пісьменнікаў (які раней называўся Саюз пісьменнікаў БССР, Саюз пісьменнікаў Беларусі) сцвярджаем: **толькі нацыянальная літаратура можа выхаваць сапраўдных патрыётаў нашай краіны. Адзіны крытэрый мастацкасці і значнасці літаратуры — не рабскае слугаванне ўладзе ці "опозиционная настроенность", а ступень любові да Радзімы і роднага слова, мастацкае ўменне казаць праўду свайму народу.**

Немецкий миллионер не транжира и ничем особенным из толпы не выделяется: одевается просто, а в костюме с галстуком, как правило, появляется лишь на официальных приемах и переговорах.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 САКАВІКА 2007 г.

ОБРАТИТЕ ВНИМАНИЕ

Планы генсека ООН

В январе 2007 года Пан Ги Мун занял пост Генерального секретаря ООН. О своих приоритетах в роли главы ООН южнокорейский дипломат рассказал в эксклюзивном интервью "Немецкой волне".

Политик убежден, что Организация Объединенных Наций способна сыграть в урегулировании конфликтов решающую роль. Однако сначала ООН необходимо провести внутреннюю реформу, чтобы повысить свою эффективность и влиятельность.

Необходима реформа Совета Безопасности.

"К сожалению, в отношения между государствами-членами ООН — крупными и малыми, богатыми и бедными — закралось недоверие, — посетовал Пан Ги Мун. — *Оставляют желать лучшего и отношения между отдельными странами и секретариатом ООН". Новый генсек надеется сыграть в организации "гармонизирующую" роль и восстановить атмосферу взаимного доверия.*

Существенным шагом к реформированию ООН дипломат считает расширение состава Совета Безопасности. Правда, конкретных претендентов на постоянное членство Пан Ги Мун называть отказался. На вопрос "Немецкой волны" о шансах Германии генсек заявил: *"Германия играет важную роль в мире. Это третье по финансовой мощи государство, которое активно участвует в жизни ООН, в первую очередь — в разработке стратегий по сохранению мира и безопасности".* Однако Пан Ги Мун подчеркнул, что сначала Берлину необходимо заручиться поддержкой своей кандидатуры у других государств ООН.

Одной из центральных задач организации на ближайшие годы генсек считает разработку единой стратегиии борьбы с глобальным потеплением. При этом важную роль Пан Ги Мун отводит США. Пока готовность Вашингтона к сотрудничеству в этой области оставляет желать лучшего.

"У меня складывается впечатление, что в США все больше осознают серьезность проблемы изменения климата, особенно — в деловых кругах и в Конгрессе, — заявил Пан Ги Мун. — *Поэтому я надеюсь, что и американское правительство серьезно задумается над тем, чтобы занять по этому вопросу более активную и конструктивную позицию".*

Генсек ООН подверг критике нежелание правительства Ирана сотрудничать с международным сообществом по вопросу ядерного досье. *"Очень жаль, что Тегеран не выполнил условия ультиматума, выдвинутого Совбезом ООН,* — сказал Пан Ги Мун. — *Теперь мяч находится на стороне Совета Безопасности, члены которого всерьез рассматривают возможность введения санкций".* Дипломат призвал руководство Ирана возобновить диалог с мировым сообществом и сесть за стол переговоров под руководством политиков ЕС.

Ширак не пойдет на третий срок

Президент Франции Жак Ширак заявил в телевизионном обращении, что не собирается в третий раз выдвигать свою кандидатуру.

Шираку сейчас 74, он руководит страной с 1995 года, а его политическая карьера охватывает четыре десятилетия. В последние дни он намекал, что собирается наконец отдохнуть от большой политики. А в своем традиционном телеобращении президент заявил, что есть и другие способы служить стране. Президентские выборы во Франции пройдут 22 апреля. Судя по последним опросам общественного мнения, нынешний министр внутренних дел страны Николя Саркози с небольшим отрывом опережает другого претендента на президентский пост, представительницу социалистов Сеголен Руаяль.

"Другим способом, но с тем же энтузиазмом и той же страстью к работе на ваше благо, я продолжу участвовать в нашей общей борьбе — в борьбе моей жизни — за справедливость, за прогресс, за мир, за величие Франции", — сказал президент в воскресном обращении и добавил, что "гордится той работой, которую мы вместе выполнили", имея в виду, в частности, улучшение условий жизни пожилых людей и инвалидов, реформу пенсионной системы и снижение преступности и безработицы.

Впервые титул самого богатого в России достался тому, кто не имеет еврейских корней

Алюминиевый и оружейный магнат Олег Дерипаска обошел нефтяного барона Романа Абрамовича, еврея по отцу, и стал самым богатым человеком России. По данным русской версии журнала Finance, личное состояние Дерипаски около 21,2 млрд долларов, примерно на 200 млн долларов превышает состояние Абрамовича. Впервые с середины 1990-х годов титул самого богатого человека России достался тому, кто не имеет еврейских корней.

Маленькая революция, произведенная Дерипаской, это часть более широкого явления: если четыре года назад примерно половина российских миллиардеров была еврейского происхождения, то к началу 2007 года эта доля уменьшилась примерно до 10%, утверждает активист Алекс Танцер. *"Налицо процесс русификации капитала,* — заявил Танцер. — *Новые богачи — это "наши люди", близкие тем, кто у власти. Евреев-олигархов, которых связывали с правлением Бориса Ельцина, вынудили уехать из страны после прихода Путина к власти, и они сошли со сцены".*

После отъезда олигархов, поссорившихся с Путиным, список самых богатых россиян по-прежнему возглавляли люди еврейского происхождения. В 2004 году тремя самыми богатыми россиянами были Роман Абрамович, Михаил Фридман и Виктор Вексельберг. Но хотя у них хватило ума сохранить хорошие отношения с Кремлем, в последние годы их обошла новая группа олигархов, которые, как полагают, ближе к Путину и его окружению. В 2007 году Абрамович был единственным человеком еврейского происхождения, входившим в пятерку самых богатых россиян.

Фрагмент из статьи Амирама Барката в "HAARETZ".

(Заканчэнне. Пачатак у №№33—40.)

Абышоўшы строй, ён выйшаў на сярэдзіну залы і пачаў гаварыць. Казаў нягучна, ціхім хрыплаватым голасам і, стоячы за пяць крокаў ад Ступака, здаўся яму зусім не маладым, хутчэй пажылым і стамлёным. А гаварыў пра тое, што дужа спадзяецца на сваю службу бясьпекі, да якой яны маюць гонар належаць, што яна — галоўная яго апора, для іх ён не пашкадуе нічога і будзе клапаціцца пра кожнага як родны бацька. Калі ў каго ёсьць якая патрэба, хай ідзе проста да яго і расказвае, — ён зробіць усё. Бо ён іх усіх любіць, як бацька любіць сыноў, што ў яго болей нікога няма, апроч іх, хлопцаў бясьпекі, ды яшчэ народу, які яго абраў на самы высокі пост. Што народ — галоўны ягоны клопат і галоўная любоў, асабліва такі народ, як наш, які вечна гаруе ў нэндзе, пакутуе праз усю гісторыю, што тое ён ведае як прафесіянал-гісторык. Што гэты народ заслугоўвае лепшае долі, чым тая, якую яму нарыхтавалі здраднікі-нацыяналісты, усе гэтыя пазьнякі, шарэцкія ды карпенкі, якія даўно запрадаліся ЦРУ ды іншым замежным сьпецслужбам і цяпер распрацоўваюць самыя хітравумныя планы, каб фізічна зьнішчыць яго і пакінуць сіратой любы беларускі народ. Таму вялікія спадзяванкі на іх — гонар ягонай бясьпекі, у руках якой ягонае жыцьцё і будучыня народу.

Ступак за жыцьцё нямала ўжо пераслухаў розных агітатараў-прапагандыстаў, у тым ліку і ў войску, і ніколі не ўспрымаў іх усур'ёз, заўжды слухаў хіба адным вухам. Не хацелася верыць і гэтаму. Але нейкая ўпартая сіла памалу, памалу, усё ж дзейнічала на ягоную сьвядомасьць; напор і шчырасьць разважаньняў пачалі даходзіць да яго разуменьня. Найперш неяк бы міжволі само сабой хацелася ў тое паверыць. Так шчыра было ўсё сказана, што зьявілася спагадлівая думка: сапраўды, як нялёгка быць кіраўніком такога маштабу, як небясьпечна і адказна.

З гэткаю думкай-пачуцьцём Ступак і стаяў у страі, трошкі нібы задумаўшыся, як пачуў, што прамова перайшла на афганскую тэму, і аж скалануўся, як той, пазіраючы ў ягоны бок, прамовіў:

— Вон пусть скажет Саша Ступак, он участник, отмеченный наградами. Он на своих плечах вынес груз дружбы с братским афганским народом...

Пачуцьцё зьдзіўленьня кальнула Ступака — глядзі ты, ён ведае! Ведае пра Афган, нават называе яго па імені, чаго ў Ступака не здаралася нават у войску, нават у Афгане. Незвычайны, дзівосны чалавек, сумеўшыся, думаў Ступак. Не сказаць, аднак, каб тыя цёплыя словы ўзрадавалі яго, — зьбянтэжылі, гэта дакладна. І ён, задуменны, пайшоў у курылку, калі ўсё скончылася і строй распусьцілі. Ён нічога ня мог нікому сказаць пра сваё ўражаньне ад той сустрэчы, ды тут і ніхто не гаварыў пра яе нічога, усе зацята маўчалі, толькі пільней прыглядваліся адзін да аднаго, нібы выпрабоўваючы: ну што? Ну як? То былі толькі маўклівыя пытаньні без адказаў.

Нечакана надышоў момант, пра які Ступак столькі перадумаў калісьці, да якога ўвесь час міжволі рыхтаваўся. Здарылася, як і шмат што ў ягоным жыцьці, нечакана, зьнянацку, самым брутальным чынам.

Уранку, яшчэ да сьняданку, пад іхнюю лясную дамоўку падкацілі адразу тры чорныя "Ландроверы", у якія порсткa, бы мышы ў норы, шаснулі іх стракатыя постаці з новенькімі, яшчэ пахучымі ад змазкі "Узі". Пад камандай незнаёмага падпалкоўніка ў скураным паліто хутка пад'ехалі да прахадной нумарнога заводу на гарадской ускраіне, які нядаўна яшчэ быў "паштоваю скрынкай"; адразу заехалі ў двор і выгрузіліся ля будынку заводакіраўніцтва. Тут жыва разьбегліся двума шэрагамі ўпоперак прыступак, утваруючы нешырокі, але і ня вузкі калідор да дзьвярэй, і застылі. Іншыя, што прыехалі раней, былі ўжо ўнутры. Усе маўчалі, аднак Ступаку стала зразумела, што яны забясьпечвалі прыезд самога. Ступак вольна стаяў на другой аднізу прыступцы і думаў, што тое самае, што валодала ім гэтулькі часу, здаецца, урэшце наблізілася ўшчыльную. Урэшце ён дачакаўся магчымасьці, пра якую столькі перадумаў, да якой імкнуўся. Ражок аўтамата быў поўны патронаў, аўтамат на грудзях у поўнай гатоўнасьці. Не хапала хіба апошняй кропкі рашучасьці. Але чаму? Хіба што-небудзь было ім няўцямлена, ці што зьявілася новае?

Нешта ўсё ж ён не пасьпеў дадумаць, каб канчаткова наважыцца, як да прыступкаў нечакана падляцеў адзін міліцэйскі "Мерседэс" з мігалкай, за ім другі такі ж самы. З іх борздка павыскоквалі людзі ў масках, разьбегліся непадалёк па завадскім наваколлі. Тады падкаціў і трэці аўтамабіль, грузны, мабыць, браніраваны "Кадзілак", з якога праз паслужліва расчыненыя дзьверы лёгка выскачыў ён. На гэты раз ён быў у цёмным, добра адпрасаваным гарнітуры, пры даўгім, да пупа, гальштуку; хуткім, амаль драпежным позіркам кінуў у адзін бок, у другі, мусіць, каб упэўніцца, што варта на месцы і ягоная ахова забясьпечаная. Ягоны цьвёрды, уладарны твар цяпер нёс няскрушную злую суровасьць. Тым самым прыдзірлівым позіркам ён акінуў абмерлую варту і, здалося, нібы спатыкнуўся на гэткай жа, як і ў яго, вусатай фізіяноміі Ступака. Ступак незнарок варухнуў кароценькай руляю аўтамату, міжволі скіроўваючы яе ўбок. Тады ж трывожна тузануліся ля пераносься русявыя бровы, але болей — нічога. Ступак абмёр, а той спружыніста скочыў цераз дзьве прыступкі вышэй і ўмомант апынуўся ля высокіх дзьвярэй, дзе яго чакала невялікая група ў цывільным і ў масках. Яны ўсе разам схаваліся ў памяшканьні. Ступак расслабіў свае напятыя мускулы і выдыхнуў.

Два шэрагі яшчэ працягвалі стаяць на прыступках, але ранейшае напружаньне мінулася, можна было разьняволіцца. Штосьці было не зразумела Ступаку, — чагось нават крыўдна, ды ён ня мог разабрацца, чаму? Можа, за сваё ранейшае, перажытое, а можа — за сёньняшняе — таго ён зразумець ня мог. Адно было пэўна — кілер з яго пакуль што не атрымаўся, і дзіўна, што тое цяпер пачало ім адчувацца, нібы палёгка. Нібы ён уратаваў жыцьцё. Найперш, можа, сваё ўласнае. Магазін ягонага "Узі" застаўся цэлы, яго належала берагчы і прымяняць толькі ў крайнім выпадку. Але — дзе той крайні выпадак, і хто будзе вызначаць яго? Ужо, мабыць, ня ён. З прыкрасьцю Ступак адчуваў, што неўпрыцям і назаўжды страчвае сваё асабістае права, якім ужо распараджаліся іншыя.

А ён што ж — ён мусіў чакаць і падпарадкоўвацца. І ён чакаў можа, з гадзіну ці болей, стоячы ўсё на той жа прыступцы, хіба мяняючы ўпор нагі. Хлопцы побач таксама чакалі. Іншай каманды ім не давалі, і Ступак пачаў думаць, што на іх забыліся. Аж не! Палкоўнік у скуранцы штось гаркнуў з дзьвярэй, і яны замерлі. Ступак чакаў зноў убачыць самога, ды замест яго ў расчыненых дзьвярах паявіліся двое ў шэрых пінжаках — высокі і ніжэйшы, якіх цесьненька абступілі хлопцы ў масках. Тыя два ішлі, патупіўшы долу сівыя галовы, неяк ненатуральна аднолькава трымаючы за сьпіной рукі. І толькі як спускаліся па прыступках, Ступак убачыў на іхніх руках бліскучыя кайданкі. Тады яму шмат што стала зразумела. Але нешта і яшчэ болей заблытвалася.

Арыштаваных павезьлі ў міліцэйскай машыне, а яны ўсё стаялі на прыступках, мусіць, чакалі самога. І Ступак думаў, што ягонае жыцьцё кудысь павярнулася. Хаця хто ведае, якім яшчэ бокам можа яно павярнуцца зноў. Усё ж жыцьцё кожнага сваю сілу мае — часам злую, нядобрую сілу...

1998 г.

Публікацыя Ірыны Міхайлаўны БЫКАВАЙ.

ФАКТ

Только Ирак опережает Россию по числу погибших журналистов

Согласно данным опубликованного отчета Международного института по безопасности журналистики (INSI), лидерами по числу погибших за последние десять лет журналистов являются Ирак, Россия и Колумбия, сообщает "Ассошиэйтед Пресс". По данным INSI, с 1996-го по 2006 год в Ираке погибли 138 журналистов, в России — 88 и в Колумбии — 72.

Всего за указанный период в мире погибли более 1000 сотрудников СМИ.

В докладе института отмечается, что за последние годы количество журналистских смертей неуклонно растет. Так, в 2001 году в мире погибли 103 представителя различных средств массовой информации, в 2004-м — 117, а в 2006 году — уже 167.

Lenta ru

Европа не допустит потепления

ЕС готов начать решение глобальных проблем в одиночку: на весеннем саммите 27 стран европейской семьи договорились к 2020 году сократить выбросы углекислого газа в атмосферу на 20 процентов от уровня 1990-го — и тем самым начать реальную борьбу с глобальным потеплением.

Проблема борьбы с глобальным потеплением рассматривалась на саммите в прямой связи с перспективой изменения энергетического баланса Евросоюза. Участники саммита взяли на себя обязательство довести долю возобновляемых источников в энергопотреблении ЕС до 20 процентов с нынешних 7.

Наблюдатели уже назвали саммит личной удачей канцлера Германии Ангелы Меркель, председательствующей в ЕС в нынешнем политическом семестре. Сама Меркель, выступая на итоговой пресс-конференции, пояснила, что показатель в 20 процентов рассчитывается в среднем по ЕС:

"Очень важно действительно освоить возобновляемые источники энергии. А это потребует настоящего технологического прорыва от стран ЕС. Разумеется, при выполнении поставленных задач необходимо отталкиваться от особенностей каждой страны, ее возможностей, традиций".

ФОТОВЗГЛЯД

Известный экстравагантными нарядами эксперт по скачкам Джон Маккририк готовится получить приз британского Клуба теле- и радиоиндустрии.

Прославленной космонавтке Валентине Терешковой очень понравился президентский лабрадор Кони. Снимок сделан при поздравлении ее Владимиром Путиным в связи с ее 70-летием.

Самые дорогие и самые дешевые города

Обнародованы данные ежегодного рейтинга 132 городов мира по ценам потребительских корзин, составленного журналом Economist.

Сомнительная слава самого дорогого города мира выпала на столицу Норвегии Осло. За ней следуют Париж и Копенгаген. Лондон переместился с 7-го места на 4-е, вытеснив Токио и Осаку, по мере того как инфляция в Японии сохранялась на нуле, а в Лондоне подскочили цены на транспорт.

Цены в Манчестере, втором городе Великобритании, включенном в список, почти идентичны ценам в Нью-Йорке и выше, чем практически в любом другом городе США.

Самая дешевая столица мира — Тегеран, где потребительская корзина стоит меньше четверти той цены, которую приходится платить лондонцам. Манила на Филиппинах и Мумбаи в Индии тоже являются дешевыми городами.

Самым дорогим городом за пределами ЕС была признана Москва, где стоимость прожиточного минимума сейчас выше, чем в Нью-Йорке.

В ходе исследования сравнивались переведенные в доллары цены на товары, включающие в себя продовольственные товары, коммунальные платежи, предметы хозяйственного обихода, а также счета за такси и рестораны. Лондон возглавляет список по ценам на транспорт и непищевые продовольственные товары, но газ и электричество остаются здесь относительно недорогими.

Многие изменения в мировом рейтинге объясняются падением доллара и ростом евро. Цены в некоторых городах США сейчас сравнительно низкие, по сравнению с ценами во многих развивающихся странах. Например, Атланта, самый дешевый город США, сейчас в рейтинге ниже, чем Касабланка в Марокко и Шеньчжень в Китае. Самым дешевым из континентов в целом признана Латинская Америка. На долю городов этого региона приходится четверть из 30 самых дешевых городов мира.

ФОТОФАКТ

Найти!

Бывший президент России Борис Ельцин заявил в милицию о пропаже документов, удостоверяющих право его владения двумя участками в Одинцовском районе Подмосковья площадью в 0,25 и 3,75 гектара соответственно, пишет газета "Комсомольская правда". Ориентировочная стоимость участков составляет от 10 до 40 миллионов долларов.

По словам помощника Ельцина, документы на участки в Барвихе были потеряны еще в прошлом году, но, как пишет издание, хватились их лишь на днях.

НУ И НУ!

Держал отца в морозилке для сохранения его пенсии

В течение трех лет 63-летний мужчина, проживающий на северо-западе Италии, хранил тело своего отца в морозильнике, чтобы продолжать получать его пенсию.

Как сообщает **France Presse,** тело обнаружил внук покойного, случайно открыв дверцу морозильника. Для выяснения обстоятельств инцидента будет проведено вскрытие, однако предварительная экспертиза показала, что смерть наступила от естественных причин.

ПАСЬЛЯСЛОЎЕ

Больш за сорак гадоў мы жылі па хранометры Васіля Быкава. Ягоныя аповесьці зьяўляліся ў друку з дзівоснаю рэгулярнасьцю, якая нагадвае звышдакладную працу астранамічнага гадзіньніка. Што ляжыць у аснове гэтае працы? Талент? Самадысцыпліна? Сумленьне, "абсалютна нязьменнае, — паводле словаў Эрнэста Хэмінгуэя, — як метр-эталон у Парыжы"? Мусібыць, і тое і другое і трэцяе разам. А яшчэ нешта ўласна быкаўскае — адчуваньне сябе ў гісторыі і гісторыі ў сабе.

Васіль Быкаў ужо ў Вялікім Часе. Адкрыцьцём быкаўскага генія сталася адкрыцьцё Часу ва ўсіх рэаліях нашага зямнога існаваньня і радыкальнае сьцьвярджэньне яго магчымасьцяў, якіх да Быкава ня ведала сусьветная літаратура. Гэта і паняцьце незваротнасьці часу, і зьвязанае з ім шкадаваньне аб упушчаных магчымасьцях, аб чым беларусы ведаюць лепш, чым хто. Гэта і паняцьце выбару, якое звужаецца да дылемы: быць альбо ня быць — нацыі, мове, самому жыцьцю. Гэта і паняцьце абсурду, калі зьнікае аптымістычная спадзяванка на шчасьлівы зьбег акалічнасьцяў і як багадаць зьяўляецца пачуцьцё рэальнасьці і маральнай адказнасьці, разуменьне сваіх кволых чалавечых магчымасьцяў у супраціве хаосу, велічы чалавечага духу. У аповесьці "Афганец" усё згаданае вышэй прысутнічае ў поўнай меры.

Своечасовасьць зьяўленьня твора ў друку — адна з унікальных асаблівасьцяў быкаўскае творчасьці. Як жа так сталася, што аповесьць, напісаная яшчэ ў 1998 годзе, адна з нямногіх рэчаў Быкава, не была апублікаваная ў той час? Былі на тое свае важкія прычыны, зразумелыя кожнаму, хто жыве ў рэальным часе і ў рэальнай прасторы.

Напрыканцы красавіка паваротнага ў жыцьці Васіля Уладзіміравіча 1998 году, калі ён быў вымушаны зьехаць за мяжу, мне паведамілі, што ён хоча сустрэцца і перамовіцца са мною. Не чакаючы, калі скончацца чарговыя пасядзелкі ў Купалаўскім музеі, мы выйшлі на падворак. Так здарылася, што па дарозе напаткалі С. С. Шушкевіча, які аклікнуў Васіля Уладзіміравіча і прапанаваў падвезьці на сваіх "Жыгулях". Відаць, у Васіля Уладзіміравіча быў іншы план, аднак ён лёгка пагадзіўся. Мяне ("дзеля кансьпірацыі") пасадзілі поруч з кіроўцам — самім С.С.Шушкевічам. "Куды?" — "На Маркса". На Маркса, аднак, не спыніліся, а на павароце да паштамту, — прыпынку не было, але Станіслаў Станіслававіч рызыкнуў. Мы выйшлі, абышлі квартал і апынуліся ў пад'езьдзе майго дому. Па дарозе Васіль Уладзіміравіч агаломшыў мяне весткаю пра тое, што вымушаны пакінуць родную Беларусь, і патлумачыў, чаму вымушаны: знакаў магчымай бяды, якая кружыла вакол яго і яго блізкіх, было занадта шмат, каб не рэагаваць адэкватна сітуацыі. У пад'езьдзе, ля паштовых скрынак, ён перадаў мне на захаваньне колеру марской хвалі папку з аповесьцю: "Гэтую павястушку публікаваць пакуль што ня час. Няхай пачакае. Я вам давяраю. Казаць пра гэта нікому ня трэба". Ад такога — самога Быкава — даверу ў мяне кругам пайшла галава, аднак я ўстрымаўся ад спакусы падзяліцца з кімсьці нашай таямніцай. Урокі кансьпірацыі атрымаў у свой час ад маці Алеся Адамовіча, падпольшчыцы, і ад самога Алеся. Мы, беларусы, наогул пагалоўна падпольшчыкі. Часам там, дзе трэба і дзе ня трэба.

У часе тэлефонных перамоваў, у меру рэдкіх, я, адказваючы на пытаньні Васіля Уладзіміравіча ("Што новага? Як Ліцэй?? Як дзеці?"), лічыў сваім абавязкам паведаміць, скаламбурыць, што "Час Ш." чакае свайго часу. Так скарочана была самім аўтарам першапачатковая назва твора, напісаная на абгортцы апошняга варыянту. Назва "Афганец" зьявілася пазьней, калі складаўся план-прасьпект быкаўскага васьмітомніка, які, на жаль, так і застаўся нязьдзейсьненым праектам. Са згоды Ірыны Міхайлаўны Быкавай пад гэтай назвай і публікуецца аповесьць.

Мяне як навукоўца асабліва ўсьцешыла тое, што ў папцы, акрамя, зразумела, чыставіка, быў рукапіс першага варыянту аповесьці і скрэсьлены ўшчэнт рукою аўтара машынапіс другога варыянту. Вядома, што Васіль Быкаў не пакідаў рукапісаў і наогул адмыслова адносіўся да лёсу сваіх твораў. Напрыклад, маючы магчымасьць у часы галоснасьці нешта паправіць, "палепшыць", сьвядома не рабіў гэтага, спадзеючыся, відаць, на строгі і справядлівы суд гісторыі. Ці не адзіны гэта выпадак (ня лічачы асобных фрагментаў іншых твораў), калі мы маем нагоду адказаць, прынамсі, паспрабаваць адказаць, на пытаньне, як адбываўся творчы працэс у Васіля Быкава, хаця і разумеем, што таямніца гэтая вялікая ёсьць. Адно застаецца спадзявацца, што нас чакае адкрыцьцё яшчэ не адной такой таямніцы жыцьця і творчасьці Васіля Уладзіміравіча Быкава.

Міхась ТЫЧЫНА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 САКАВІКА 2007 г.

АКТУАЛЬНО

Одиссея бабули со шваброй

Кому положено убирать подъезды домов?

Казалось бы, рядовой коммунальный вопрос, но сколько он в городах и весях вызывает разнотолков — финансовых, организационных, психологических!

В одних городах Беларуси, в частности, в Минске и Гомеле, по заверению министра ЖКХ **Владимира Белохвостова**, лестницы и лестничные клетки драют и моют работники местных ЖЭСов. А в Бресте — кому душа пожелает. По заявлению министра, на проходившей в городе над Бугом коллегии областного управления ЖКХ, коммунальные службы Бреста проигнорировали поручение министерства и не выполнили его. Таким образом, в одних домах жильцы по обыкновению скидываются по пару тысяч рублей в месяц и нанимают уборщика, в других — по очереди дежурят и сами убирают на лестничной клетке. Особняком, в виде исключения, — подъезды, где уборку ведут работники местных ЖЭСов.

Так кому же все-таки убирать лестничные марши и площадки — "наемникам", самим жильцам или жилищно-коммунальной службе?

Есть *"Инструкция о порядке оплаты населением жилищно-коммунальных услуг"*, утвержденная постановлением Минжилкомхоза РБ N 13 от 24.05.2004 года и согласованная с Минэкономики. Согласно ей, жильцы платят за техническое обслуживание жилых домов. В инструкции недвусмысленно сказано: *"Техобслуживание жилого дома включает затраты подрядных организаций по текущему содержанию жилых домов, придомовых территорий (текущая эксплуатация и ремонт общего имущества, УБОРКА И ОСВЕЩЕНИЕ ВСПОМОГАТЕЛЬНЫХ ПОМЕЩЕНИЙ, придомовой территории)"*. А вспомогательные помещения — это лестницы и лестничные клетки, коридоры и лифтовые шахты, подвалы, технические этажи и т. д.

Казалось бы, вопрос ясен, как божий день: люди платят за услуги, а коммунальники должны убирать подъезды. Но это по документам, а на практике получается с точностью до наоборот.

«Я бы хоть завтра убирал»

Сложившуюся ситуацию комментирует начальник ЖРЭУ Бреста **Павел Заграй:**

"Мы начали изучать этот вопрос, когда один из жильцов стал везде писать и якобы добился того, что "сверху" указали наладить уборку подъездов силами коммунальной службы. Но в каждой области система ЖКХ имеет свои нюансы. С 70-х годов в Бресте уборка подъездов силами коммунальной службы не производилась, а до этого, может, и делалась, но никто уже этого не помнит. В подъездах многоэтажных домов (выше пяти) в Бресте дворники убирают лестничные площадки первых этажей и кабины лифтов. Полная уборка всех подъездов — снизу доверху — силами домоуправлений производится только в тех из них, где живут немощные старики.

Что такое организовать в Бресте уборку всех подъездов силами городского ЖРЭУ? Это значит, ввести в штат дополнительно 280 работников, которым нужно выделить спецодежду, ведра, моющие средства, швабры, тряпки... Затраты на это — дополнительно около 3 миллиардов рублей в год из городского бюджета! На эту сумму в городе можно выполнить половину годовой программы капремонта жилья! У нас содержание жилья и так дотируется — жильцы оплачивают только 47% от стоимости. Но мы в те проценты не включаем уборку подъездов.

Я бы вам хоть завтра убирал, но тогда стоимость одного "квадрата" жилья для жителей возрастет с 450 до 600 рублей.

Чем плохо, что при нехватке бюджетных средств наши люди приучены сами убирать лестничные площадки? Я считаю, что, как показывает практика, нецелесообразно переходить на уборку подъездов силами ЖКХ. Если мы это будем делать, то нарвемся на жалобы жильцов, что наши работники делают это некачественно: "Почему ваша бабуля (молодежь ведь на такую работу не пойдет) моет наш подъезд той же тряпкой, что и соседний, где больше грязи?" "Не хочу, чтобы она возюкала шваброй мои новые двери".

Мы — на распутье: не знаем, что делать".

Право выбора

В то же время позиция Министерства жилищно-коммунального хозяйства однозначна: брестские коммунальные службы должны убирать подъезды своими силами. О чем им давалось соответствующее поручение, однако они его не выполнили.

Как понять жильцам: почему в то время, как тариф на техобслуживание жилья по всей Беларуси один и тот же, в Минске и Гомеле коммунальники выполняют эту работу, а в Бресте игнорируют?

Но ведь жители города над Бугом платят по данной статье не меньше. Почему же они должны еще и убирать сами, когда за эту услугу уже оплачено? Но, как выяснилось, оплата населением за техобслуживание в Бресте не идет на уборку подъездов, а направляется на другие статьи техобслуживания: текущую эксплуатацию и ремонт, освещение подъездов, вспомогательных помещений, придомовой территории.

Министр отрасли Владимир Белохвостов, принимавший участие в недавней коллегии Брестского областного управления ЖКХ, видит два пути решения этой проблемы. Первый — приводить все города и веси республики к одному нормативному знаменателю, то есть убирать подъезды силами ЖЭСов. Второй путь — уменьшить плату за техническое обслуживание жилья, если жильцы убирают подъезды сами. Нужно только просчитать, на сколько. Пусть люди сами определятся, какой путь им предпочтительней.

Предвижу возражения коммунальников: мол, если люди выберут первый путь, то дополнительно нужны большие деньги из бюджета. Тут коммунальникам и карты в руки: стучитесь в двери! Кто мешает Брестскому ЖРЭУ поставить этот вопрос перед горисполкомом, горсоветом и в конце концов перед депутатами? Раз их называют народными избранниками, так пусть попекутся о народе.

И после этого у некоторых еще язык поворачивается назвать Брест маленьким Парижем. Какой Париж?! По чистоте и ухоженности подъездов (за некоторым исключением) город над Бугом впору сравнить разве что с каким-нибудь захолустьем. И не надо винить в том какую-то бабулю со шваброй в руках.

Александр КОВАЛЬЧУК.

ЧУЛІ?

Ураджайны на двайнятак

У Беларусі мінулы год стаўся самым "ураджайным" на двайнятак за апошні час, паведамляе БЕЛТА. У 2006 годзе нарадзіліся 828 двайнятак, 13 трайнятак і нават 1 чацвярня.

Чацвёра малых з'явіліся на свет у маі мінулага года ў Жлобіне. Дарэчы, гэта другі унікальны выпадак нараджэння чацвярні — апошні раз квартэтам хлопчыкаў папоўнілася сям'я мінчан у кастрычніку 2004 года. У тым жа 2004 годзе нарадзіліся толькі 704 двайнятак і 6 трайнятак.

Теперь считать мы стали годы

К 2050 году продолжительность жизни во всех 27 странах нынешнего Европейского Союза будет превышать 80 лет, говорится в пресс-релизе статистического агентства "Евростат". Ожидается, что в течение ближайших десятилетий там будет наблюдаться рост продолжительности жизни как женщин, так и мужчин. Причем у мужчин этот процесс будет идти более активно.

В минувшем году в странах ЕС средняя продолжительность жизни у женщин оценивалась в 81,5 года, а у мужчин — в 75,4 года. При этом наибольший разрыв — 12 лет — наблюдался в Латвии и Литве, тогда как наименьший — 4 года — был отмечен в Великобритании, Нидерландах, Швеции и на Мальте. В среднем разрыв по этим показателям в ЕС составляет около шести лет.

Наибольшая средняя продолжительность жизни среди женщин к 2050 году будет во Франции (89,1 года), Италии (88,8) и Бельгии (88,3 года). При этом во всех 27 странах средняя продолжительность жизни представительниц слабого пола будет выше 80 лет.

Белорусской демографической программой еще только ставится задача, чтобы к 2010 году средняя продолжительность жизни в стране составила 70 лет. Пока мы не дотягиваем даже до этого показателя: женщины в Беларуси живут 74 года, а вот среди мужчин далеко не все даже до пенсии доживают — средняя продолжительность жизни 63 года. Риторический вопрос — почему?

Олег СНОВ.

Беларусак не пусцяць у Іарданію

Іарданія абвясціла вайну прастытуцыі. З 1 сакавіка ўезд у краіну забаранілі грамадзянкам Украіны, Расіі, Арменіі, Эстоніі, Балгарыі, Румыніі, а таксама Беларусі ва ўзросце да 40 гадоў.

Прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва з краін-экспарцёраў жаночай прыгажосці ніякія абмежаванні не кранулі. Таксама, як і жанчын старэйшага ўзросту. У пералік краін трапіла і Малдова, але грамадзянкі гэтай краіны даўно ўжо не маюць дазволу на ўезд у Іарданію, адзначаюць інфармагенцтвы.

У Беларусі пачалася веснавая паводка

У сувязі з пацяпленнем у нашай краіне рэкі пачалі выходзіць з берагоў: у Гомельскай вобласці вада паднялася ў Дняпры, Прыпяці, Пцічы і Убараці.

Выхад рэк на абалону адзначаецца ў Лоеўскім, Жыткавіцкім, Петрыкаўскім, Лельчыцкім і Мазырскім раёнах.

За суткі ўзровень вады паднімаецца на 2—3 сантыметры. Пры гэтым максімальны пад'ём зарэгістраваны на Прыпяці каля Турава.

Між тым спецыялісты запэўніваюць, што вялікай паводкі гэтай вясной не прадбачыцца. Зіма была цёплай, таму глеба не паспела моцна прамерзнуць. І ўсё ж да магчымай паводкі падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях падрыхтаваліся. Сітуацыя, па словах спецыялістаў, цалкам кантралюецца.

Ігар МАРОЗАЎ.

ПАМЯЦЬ

Яна памерла ў святочны дзень...

Усім вядома, што людзі вечна не жывуць, што кожнаму чалавеку наканавана калі-небудзь пакінуць гэты свет. Такі закон прыроды, а закон — гэта дадзенасць, якая не стасуецца з эмоцыямі. Аднак, калі нас пакідаюць сваякі і сябры, мы скардзімся (Богу?) на несправядлівасць, задаемся пытаннямі: "За што? Навошта?"

У мінулы чацвер, 8 сакавіка, беларуская культура панесла вялікую страту. Памерла **Ірына Мікалаеўна МЯТЛІЦКАЯ**, прынцыповы мастацкі крытык, таленавіты літаратар, знаўца гісторыі культуры, арганізатар культурніцкіх імпрэз нацыянальнага маштабу. Гэта калі карыстацца стылем афіцыйных некралогаў. Але ў дадзеным выпадку казённая мова насамрэч адлюстроўвае сутнасць падзеі. Так, вялікая страта. Для ўсіх, хто ведаў Ірыну як чалавека, хто працаваў з ёю — а такіх, лічы, увесь Саюз мастакоў і Міністэрства культуры ў дадатак. Ірына Мікалаеўна не гублялася ў творчым асяродку. Нават вонкава яна вылучалася з грамады. Надзвычай прыгожая жанчына з выразна ўсходнімі, як і ў яе маці, рысамі твару, што для нашых мясцін — экзотыка. Яна ўмела быць неабходнай і незаменнай. Відавочны плён яе працы — гэта выставы і пленэры, шматлікія публікацыі. Менш бачныя, але не менш важныя тыя справы, да якіх Мятліцкая прычынялася нібыта ўскосна, але менавіта яе прысутнасць вызначала ў канчатковым выніку поспех.

Мятліцкая — яе прозвішча па мужу, скульптару Аляксандру Мятліцкаму. У 1980-я гады ён быў адным з лідэраў беларускай пластыкі. З яго асобаю грамада звязвала вялікія надзеі. Дасведчаныя людзі кажуць, што без сваёй жонкі, без яе пазітыўнага ўплыву Аляксандр наўрад ці здолеў бы здзейсніць тое, што здзейсніў. На жаль, іх шлюб не быў шчаслівым. Пасля разводу Аляксандра Мятліцкага як падмянілі. Мабыць, і ягоная заўчасная смерць была выклікана тым, што надзвычай таленавіты, але свавольны мастак аказаўся, так бы мовіць, прадастаўленым самому сабе.

Пайшоў другі год, як Ірына пахавала сваё адзінае дзіця — дачку Ганну. Тая скончыла Беларускую мастацкую акадэмію як тэатральны мастак. Ужо першыя яе самастойныя работы далі падставы гаварыць пра ўзыходзячую зорку. Ганне прапаноўвалі працу па прафесіі ў Маскве. Пасля смерці дачкі Ірына некалькі разоў трапляла ў бальніцу з хворым сэрцам. Казалі, што толькі ўнук падтрымліваў у яе жаданне жыць.

Некалькі апошніх гадоў Ірына Мятліцкая рыхтавала вялікую рэтраспектыўную выставу твораў мужа, працавала над кнігай пра час, калі яны з Аляксандрам былі разам. Кніга абяцала стаць бестселерам, бо Ірына збіралася "вынесці смецце з хаты". Гэта значыць, распавесці пра стасункі ў творчым асяродку, згадаць пэўныя імёны ў не надта прыгожым кантэксце. Каб напісаць кнігу, Ірына нават пакінула пасаду кіраўніка галерэі Саюза мастакоў. Яна ўвогуле не трымалася за крэсла. Яшчэ раней Мятліцкая, не шкадуючы, звольнілася з Міністэрства культуры. Кніга засталася няскончанай. Паралельна Ірына паспяхова асвойвала нязвыклую для сябе працу драматурга. П'еса, над якой яна працавала, уяўляла сабою фантастычную трансфармацыю падзей жыцця самой Ірыны. Гэтая п'еса таксама засталася няскончанай.

Ірына Мятліцкая была звяном, якое лучыла з радзімай мастака Барыса Заборава, самага вядомага з нашых эмігрантаў. Барыс Абрамавіч лічыў Ірыну лепшым, а дакладней, адзіным у Беларусі мастацтвазнаўцам. Іх тэлефонных размоў па лініі Парыж—Мінск хапіла б на эпапею памерам з "Вайну і мір".

...З бальніцы труну не павезлі дадому. Ірына Мятліцкая мела сціплае жытло. Калі б у яе аднапакаёўку, спрэс застаўленую кніжнымі паліцамі, занеслі труну, дык не засталося б дзе нагою ступіць. Развітанне адбылося ў рытуальнай зале пры камбінаце рытуальных паслуг, што на Альшэўскага. Праводзілі Ірыну ў апошні шлях паводле праваслаўнага канону. На пахаванне прыйшлі мастакі. Секцыя скульптуры Саюза мастакоў (пра скульптуру Ірына пісала найбольш) — увогуле ў поўным складзе. Былі журналісты і мастацтвазнаўцы. Былі блізкія і сваякі. Асабліва цяжка страту перажывалі маці і бацька Ірыны.

Пахавалі яе на Паўночных могілках. Там цяпер побач два крыжы. На адным надпіс "Ганна Аляксандраўна Мятліцкая", на другім — "Ірына Мікалаеўна ..." Дачка і маці.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ЧУЛІ?

Халява для аўтааматараў скончылася

Мяркуецца, што з 19 сакавіка практычна ўсе мінскія паркоўкі зноў стануць платнымі.

Нагадаем, што з Новага года, пасля таго як Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №589 "Аб упарадкаванні работы аўтамабільных стаянак і аўтамабільных парковак", аўтааматары ў задавальненні пацерлі рукі — паркоўшчыкі зніклі са сваіх працоўных месцаў. Іх адправілі ў вымушаны адпачынак, пакуль паркоўкі не будуць абсталяваны пэўным чынам — шлагбаумамі і паркаматамі.

Праз два тыдні вярнуліся на працу толькі 40 працэнтаў паркоўшчыкаў, 19 сакавіка, па словах начальніка неахоўваемых платных парковак КУП "Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі" **Леаніда Дарашчонка**, выходзяць астатнія.

"Была затрымка, таму што ўносіліся змяненні ў праект рашэння Мінгарвыканкама, — кажа Леанід Пятровіч. — *Думаю, што да пятніцы дакумент будзе падпісаны, і, як толькі яго атрымаем, паркоўшчыкі ў момант выходзяць на працу".*

Зрэшты, пакуль дакумент не падпісаны, "гоп" казаць, напэўна, ранавата. Паркоўшчыкам ужо даўно абяцаюць выхад на работу, аднак іх "вымушаны адпачынак" зацягнуўся аж на два месяцы.

Алесь СІВЫ.

СКАНДАЛ

Белоруска дает показания

Брат президента Израиля Моше Кацава, Лиор, вслед за своим ближайшим родственником может предстать перед судом по обвинению в развратных действиях по отношению к молодой девушке.

Как сообщил Второй канал Израильского телевидения, иммиграционной полицией на днях была задержана гражданка Беларуси, находившаяся на территории Израиля без соответствующих разрешений.

На допросе девушка призналась, что приехала подзаработать. Она работала в одной из гостиниц на юге страны. Однако дальнейшие показания девушки удивили полицейских. Она рассказала, что около двух лет назад в этой гостинице останавливался брат президента Лиор Кацав, который вел себя по отношению к ней непристойно и домогался близости.

Показания подтвердились проверкой на полиграфе.

В связи с показаниями девушки начато следствие, пишет MIGnews.com.ua.

ЗДАРЭННЕ

Параніў міліцыянера

У папраўчай установе адкрытага тыпу ў Віцебску ў выніку нападу асуджанага супрацоўнік міліцыі атрымаў нажавое раненне. Як паведамілі БелаПАН у МУС Беларусі, супрацоўнікі папраўчай установы спрабавалі затрымаць за наўмыснае пашкоджанне маёмасці асуджанага да абмежавання волі 32-гадовага мужчыну, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. У момант затрымання ён кінуўся з нажом на дзяжурнага міліцыянера, прапаршчыка, і параніў яму руку.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Грядут ли в Минздраве громкие отставки?

В самом ведомстве опровергают слухи о том, что в Администрации президента ищут замену министру здравоохранения Василию Жарко.

О том, что систему здравоохранения уже в скором будущем может возглавить новый человек, заговорили недавно. Ушла из жизни бывший министр, сенатор Людмила Постоялко, поддержкой которой пользовался Василий Жарко. Якобы осторожный и малоинициативный министр не совсем устраивает чиновников из высших эшелонов власти.

Стоит отметить, что почти за год работы на высоком посту Василий Жарко ни разу не появился перед журналистами. На встречи с представителями масс-медиа приходили сотрудники разных рангов Минздрава, но ни разу о делах ведомства и всей системы здравоохранения не рассказал сам министр. Прежние руководители Минздрава — Людмила Постоялко, Владислав Остапенко, Игорь Зеленкевич — на встречи в Национальный пресс-центр приходили регулярно. Значит ли это, что Жарко неуверенно чувствует себя в кресле?

Первый заместитель Василия Жарко Роберт Часнойть (*на фото*) опровергает слухи об отставке министра. Говорит, что в ведомстве царит рабочая обстановка, все трудятся в прежнем режиме. Рассказал Роберт Александрович и о том, как ему работается в новой должности. Стоит напомнить, что на должность первого заместителя министра здравоохранения Роберт Часнойть был назначен в октябре 2006 года.

— За мой 30-летний стаж руководящего сотрудника нынешняя должность самая ответственная и высокая, — говорит Роберт Александрович. — Объемы работы, конечно, увеличились, но основные принципы работы были мне знакомы. Думаю, что процесс адаптации в новой должности занял не больше недели.

— Вы курируете самую ответственную сферу системы здравоохранения — лечебно-диагностический процесс. На Ваш взгляд, какие проблемы в первую очередь необходимо решать в этой сфере?

— Прежде всего, качественное оказание медицинской помощи. В связи с этим возникают вопросы кадрового обеспечения, очередей в поликлиниках.

В последнее время мы успешно решаем вопросы с оснащением клиник современным оборудованием. А последние три года в Беларуси, как ни в одной другой стране СНГ, успешно решался вопрос с материальной базой клиник всех уровней, оснащением современным оборудованием операционных блоков областных и межрайонных центров, создания научно-практических центров. Каждый год на переоснащение материально-технической базы организаций здравоохранения тратится более 300 млрд рублей. Деньги идут из республиканского и местных бюджетов.

— А сколько запланировано выделить средств на развитие системы здравоохранения в этом году?

— Я бы не стал приводить общие цифры. О том, на сколько увеличились объемы финансирования системы здравоохранения, говорит тот факт, что в стране значительно увеличились расходы на одного жителя. В прошлом году на лечение одного белоруса выделялось 150 долларов в год. В этом уже запланировано 185 долларов. А в целом объем финансирования системы здравоохранения увеличился на 19 процентов. Это великолепные цифры. Опять-таки ни одна из стран СНГ не может похвастаться такой статистикой. Последние пять лет мы стабильно занимаем первое место среди стран СНГ по данным показателям.

— Роберт Александрович, чувствуется, что в курс дел Вы вошли. А семью перевезли в Минск?

— На частные вопросы не отвечаю...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 САКАВІКА 2007 г.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Аляксей ШАДЗЬКО:

«Пад лозунгі, як правіла, становяцца бяздарнасці, каб стаць больш заўважанымі...»

15 сакавіка ў Палацы культуры Мінскага трактарнага завода Аляксей Шадзько і гурт "Сястра" прэзентуюць новы альбом "Тайга". На дыску 11 кампазіцый. Адна з песень была напісана для фільма, але не ўвайшла. У альбоме яна жартаўліва пазначана як "лішняя"...

— Гэта альбом для дарослых, — характарызуе дыск Аляксей Шадзько. — Так склалася, што асноўная частка нашай аўдыторыі — гэта людзі, якім за трыццаць. На жаль, мала студэнтаў. Але я думаю, што так пойдзе і далей. Бо "Тайгу" трэба мэтанакіравана слухаць. Гэта песні не для фону і не для танцаў. Праўда, напачатку мне хацелася запісаць больш "шырокі" альбом, у плане спектру патэнцыйных слухачоў. Выкарыстаць нейкія модныя фішкі, маладзежныя аранжыроўкі. Атрымалася ж наадварот. Ды гэта і няблага: жанр ёсць жанр. Сваіх слухачоў мы не згубім, іх нямала, і яны нас любяць. Час аншлагаў для "Сястры" ў Мінску ўжо прайшоў, але недахопу ўвагі я не адчуваю".

"Тайга" адчуваецца як лагічны працяг папярэдніх альбомаў гурта, але ўжо цяпер Аляксей прызнаецца, што хацеў бы зрабіць "што-небудзь новае":

— Хочацца чагосьці больш камернага, акустычнага — надакучылі ўжо аранжыроўкі, дзе шмат музычных інструментаў, драйвавае гучанне, — працягвае Аляксей. — Таксама можна было б выпусціць яшчэ адзін зборнік найлепшых песень — мне прапануюць гэта зрабіць і ёсць такая патрэба.

А яшчэ Аляксей Шадзько падумвае над тым, каб напісаць п'есу, — калі будзе пабольш часу.

— Мне падабаецца пісаць, выказваць свае думкі, — прызнаецца ён. — Але гэта хутчэй хобі, чым сродак для атрымання грошай.

Аляксей не верыць у існаванне "чорнага спіса" музыкаў у міністэрстве, але лічыць, што ён ёсць — у галовах работнікаў палацаў культуры, радыёстанцый. І таму ў гуртоў бываюць праблемы з арганізацыяй канцэртаў. Сам Шадзько размяжоўвае творчасць і палітыку. Лічыць, што яны несумяшчальныя.

— Асабістыя палітычныя погляды — гэта адно, а праца ў тэатры — зусім іншае, — выказвае сваю думку Аляксей. — Наогул, я негатыўна стаўлюся да любых лозунгаў. Што датычыцца сферы культуры, то пад лозунгі, як правіла, становяцца бяздарнасці, каб стаць больш заўважанымі. Я ведаю, што ніхто з удзельнікаў канцэртаў "За Беларусь!" насамрэч тое не думае, што прапагандуе. На сцэне яны кажуць адно, а за кулісамі — зусім іншае.

Трэба адзначыць, што я з павагай стаўлюся да Лявона Вольскага. І гэта якраз адно з выключэнняў, калі чалавек насамрэч верыць у тое, што робіць. Але калі б ён быў абсалютна нейтральным у палітычных поглядах і не выражаў іх у творчасці, мяркую, ён быў бы не менш таленавітым і паважаным. Але ёсць людзі, якія прытрымліваюцца супрацьлеглай пазіцыі. Напрыклад, я выступаў на юбілеі Уладзіміра Гасцюхіна. І мне не сорамна, бо я ведаю, што ён шчыры ў сваіх поглядах. І як артыста я яго паважаю.

На пытанне "А самі Вы прытрымліваецеся нейтральнай пазіцыі?" Шадзько адказаў так:

— Не, мне шмат чаго не падабаецца і з аднаго, і з другога боку. Суцэльны падман у сродках масавай інфармацыі — я маю на ўвазе тэлебачанне і некаторыя выданні. Прычым без усялякай прычыны — рэвалюцыйнага становішча ў краіне зараз няма. Дык навошта паўтараць казкі пра тое, як усё добра? Што гэта мне нейкія дамаросныя палітолагі, якія, напэўна, далей за Віцебск не выязджалі, распавядаюць пра заходні лад жыцця? Не так даўно вось лаялі Літву, а цяпер кажуць, якая яна добрая, бо стасункі з ёй наладжваюцца. Навошта гэтая хлусня? Усе баяцца. Час канфармістаў, страху і хлусні...

Вальжына КОРСАК.

НОВАЕ ІМЯ

Таццяна БЕЛАНОГАЯ:

«У плакаты з радаснымі тварамі беларускіх сялянак, мне здаецца, ніхто не верыць...»

Гэтая зусім маладая дзяўчына ўжо даўно вядомая беларускім аматарам бардаўскай песні. У 2004 годзе яна стала лаўрэатам фестывалю "Бардаўская восень" у Польшчы. А ў мінулым годзе Таня заняла першае месца ў міжнародным конкурсе "ОРРА 2006" і атрымала магчымасць запісу альбома. Праўда, прыхільнікі і дагэтуль маглі пачуць Таццяніны спевы ў запісе — на дыску "Пабачыць свет".

Зараз Таццяна Беланогая навучаецца на прыродазнаўчым факультэце ў БДПУ імя М.Танка.

"Калі паступала, было такое рамантычнае памкненне вандраваць па ўсім свеце, — гаворыць яна. — Але падчас першай практыкі расчаравалася — мы сядзелі ў Мінску..."

Паралельна Таня атрымлівае другую вышэйшую адукацыю — вывучае англійскую мову. Вольнага часу, па ўласным прызнанні, у яе амаль не застаецца. А ў той, што ёсць, Таццяна шмат чытае. Як яна кажа, менавіта літаратура прывяла яе ў музыку...

— Мне заўсёды падабалася музыка і літаратура, — гаворыць Таццяна. — Можна сказаць, што ў музыку я прыйшла праз літаратуру. Бо цікавілася беларускай паэзіяй — творчасцю Яўгеніі Янішчыц, Анатоля Сыса. А паралельна на гітары грала нейкія дваровыя песенькі. А потым падумала: чаму няма на беларускай мове такіх песень, чаму б іх не скласці? І так атрымалася, што спалучэнне літаратуры і музыкі ў мяне вылілася ў бардаўскую песню.

— Каму прысвечаны твае песні пра каханне, калі не сакрэт?

— Песні пра каханне прысвечаны чалавеку, які бачыць мой унутраны свет, бачыць ува мне болей, чым іншыя. Для астатніх людзей я магу праспяваць нешта агульнае. А песні пра каханне — для двух чалавек, якія складаюць свой сусвет. Пра гэта можна вельмі шмат казаць. Тэма кахання — галоўная для жанчыны. Гэта нам найперш трэба. Калі кахання няма, то навошта тады мы? Я лічу, па жанчынах можна меркаваць пра краіну. Калі яна ідзе па вуліцы, стомленая, цягне вялізныя торбы — і краіна такая самая! Яна мусіць быць шчаслівай, усміхацца... А ў плакаты з радаснымі тварамі беларускіх сялянак, мне здаецца, ніхто не верыць.

— Чым дзяўчына-бард адрозніваецца ад іншых асоб жаночага полу?

— Тым, што яна выходзіць на сцэну. А яшчэ тым, што бард умее зняць маску з людзей пры дапамозе слоў і гітары, "падкавырнуць" так і зняць...

— А што пад маскай?

— Пад маскай — праўда!

— Чым ты захапляешся, акрамя спеваў?

— Мастацтва ў маім жыцці наогул іграе вялікую ролю. Я заўжды любіла чытаць, асабліва — ліставанні, напрыклад, Жорж Санд з кімсьці, ці Цвятаевай з Горкім... Раней я мела сяброў, з якімі мы ліставаліся. І гэта былі такія лісты, упрыгожаныя, размаляваныя, што іх шкада было дасылаць! Пасля гэта неяк спынілася... Але нават зараз, калі пішу камусьці віншаванне на свята, то атрымліваецца цэлы ліст у паштоўцы! Калі ў мяне ёсць асадка і аркуш паперы, адразу ўключаецца нейкі механізм, і аказваецца, што вельмі шмат хочацца сказаць... Мастацтва наогул для мяне — як каханне. Без гэтага я сябе не ўяўляю! Часам люблю "адводзіць душу": фатаграфаваць, маляваць. Гэта ўсё, зразумела, не прафесійна. Я і не называю гэта карцінамі — так, малюнкі, здымкі... Можна, напэўна, і пра музыку так сказаць. Праўда, цяпер я намагаюся да яе ставіцца больш прафесійна, сур'ёзна. Таму што ёсць слухачы, якім мая творчасць цікавая, і для іх мне не хочацца рабіць "кухонныя" запісы...

— Банальнае пытанне, але... Як нараджаюцца песні?

— Яны прыходзяць адразу, нейкай плынню. Я рэдка песні дапісваю, перапісваю. Напэўна, толькі ў адной кампазіцыі "Метро" (яна будзе ў новым альбоме) першы радок я напісала яшчэ на другім курсе, а скончыла яе толькі зараз. Але гэта якраз выключэнне, якое пацвярджае правіла. Раней пісала амаль толькі ў Маладзечне. А цяпер галоўнае, каб побач гітара была — дома бываю вельмі рэдка! Кожная песня — як першая, не падобная да астатніх.

— Тваё пакаленне году нараджэння 1984-га адрозніваецца ад іншых?

— Так, не толькі 1984 году, гэтыя межы шырэйшыя. Але мы ўжо не такія, як, напрыклад, нашы бацькі. У нас іншая кроў — я гэта адчуваю. Час змяняецца, і вельмі хутка. Але наша пакаленне ўжо сфарміравалася, мы нават праз дваццаць год будзем заангажаваныя на палітыцы. Можа, потым прыйдуць людзі больш спакойныя, дыпламатычныя, талерантныя. А мы застанемся такімі, як цяпер. Галоўнае — не заганяцца. А то нават у паветры адчуваецца электрычнасць, людзей цікавіць найперш, каго дзе схапілі і пасадзілі, а гэта ўжо хвароба! Трэба пачынаць жыць. Нармальна жыць.

— Твае планы на бліжэйшую будучыню?

— Я хачу жыць.

— А зараз хіба не жывеш?

— А гэта вельмі цяжка, вельмі мала людзей насамрэч жыве. Каб жыць, трэба пачаць з сябе, знайсці нешта ўнутры сябе, слухаць сваё сэрца. З больш матэрыяльнага — выпусціць альбом, з'ездзіць на фестываль у Польшчу — Вроцлаў...

— І калі чакаць новы альбом?

— Спадзяюся, што ўвосень. Мы яго ўжо запісалі, на грошы, якія я выйграла на Міжнародным конкурсе "ОРРА 2006". Засталося самае цікавае — афармленне. Палова песень там з папярэдняга альбома "Пабачыць свет", але аранжыраваныя па-іншаму, запісаныя з іншымі музыкамі. Наогул, я не лічу "Пабачыць свет" паўнавартасным альбомам. Гэта проста, каб людзі маглі па-за канцэртамі пачуць, што я спяваю. Назва альбома пакуль невядомая — іх прыдумваю не я, а мой сябар Віталь. Наогул творца не можа быць адзін, яму патрэбны памагатыя... Таму мне хацелася б падзякаваць Андрэю Плясанаву. Ён адчувае, што мне патрэбна ягоная дапамога, як бацькоўская. І маёй сяброўцы Святлане, Сяргею Будкіну і "Тузіну гітоў", людзям, якія робяць мой сайт, майму гітарысту Зміцеру Крамушчанку.

Вальжына КОРСАК.

АНОНС

«Гэта мемарыял жанчынам, якія страчваюць сваіх дзяцей...»

Студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Ягор Лёгкін ставіць свой дыпломны спектакль па п'есе Карэла Чапека "Маці" на сцэне Купалаўскага тэатра.

Прэм'ера адбудзецца 16 і 20 красавіка.

Штогод Міністэрства культуры праводзіць конкурс сцэнарыяў сярод маладых рэжысёраў. Спаборніцтва дае магчымасць моладзі рэалізоўваць свае задумы ў галіне тэатральнага мастацтва, арыгінальных тэатральных пастановак. А пераможцы атрымліваюць дзяржаўны заказ на пастаноўку спектакляў у тэатрах Беларусі.

У мінулым годзе адным з пераможцаў конкурсу стаў **Ягор Лёгкін,** студэнт тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (спецыялізацыя — "рэжысура драмы").

— *Напачатку я збіраўся ставіць дыпломны спектакль у сваім родным горадзе Магілёве, бо працаваў там калісьці акцёрам,* - прызнаецца Ягор. — *Але ў мінулым годзе я паставіў "Майго беднага Марата" Аляксея Арбузава на сцэне Тэатра-студыі імя Міровіча. Гэты спектакль вельмі спадабаўся Валерыю Мікалаевічу Раеўскаму. І ён прапанаваў мне напісаць эксплікацыю па нейкім матэрыяле і прадставіць яе на конкурс...*

Ягор Лёгкін таксама іграе ў Тэатры-студыі кінаакцёра. І кажа, што рэпетыцыі там праходзяць больш свабодна, чым у Купалаўскім. Акцёры галоўнага сталічнага тэатра больш дысцыплінаваныя — амаль ніколі не спазняюцца на рэпетыцыі.

Галоўную гераіню — Маці, сыграе **Зоя Белахвосцік.** Старэйшага сына, доктара — іграюць **Аляксандр Малчанаў** і **Аляксей Чарнігін.** Лётчыка — **Мікалай Прылуцкі** і **Дзмітрый Есяневіч.** У спектаклі таксама заняты **Міхаіл Зуй, Сяргей Чуб, Павел Яскевіч, Андрэй Дробыш** і **Раман Падаляка**. Праўда, **Дзмітрый Есяневіч** і **Раман Падаляка** пакуль у рэпетыцыйным працэсе не ўдзельнічаюць — яны заняты ў прэм'еры спектакля "Вольга".

Па сюжэце, на працягу п'есы Маці па чарзе губляе ўсіх сваіх дзяцей. За пятнаццаць гадоў да пачатку дзеі падчас выканання ваеннага задання гераічна гіне бацька. І дзеці таксама выбіраюць шлях абаронцаў Радзімы. І таксама гінуць. Маці намагаецца выхаваць малодшага сына па-іншаму. Але раптам пачынаецца сусветная вайна, і ён усё ж збіраецца змагацца. І тут паўстае пытанне — зрабіць сына маральным уродам і пакінуць жывым ці рызыкаваць ягоным жыццём у імя Бацькаўшчыны...

У п'есе Чапека Маці ўсё ж выпраўляе сына на вайну.

— *Але спектакль заканчваецца больш светла,* — кажа Ягор. — *Не буду казаць падрабязней, няхай гэта будзе сюрпрызам. У прынцыпе, мой пункт погляду збольшага супадае з аўтарскім. Чапек таксама піша пра сэнс слова "Маці". Гэта Маці, што нараджае дзіця і не хоча ведаць: дзеля чаго яно памірае? Ці Маці-Зямля, якая носіць нас усіх? Наогул, гэтая п'еса і спектакль — мемарыял жанчынам, якія страчваюць сваіх дзяцей. Нягледзячы на тое, што ў нашай краіне зараз няма такой страшнай вайны, я лічу, што і цяпер такі спектакль патрэбны.*

Дарэчы, маці маладога рэжысёра збіраецца прыехаць на прэм'еру. Па меркаванні Ягора, яна ў такой сітуацыі таксама адпусціла б сына змагацца за Бацькаўшчыну...

Андрусь ЛЯСКО.

КИНОПРОДУКТ

Круче бывает, но не у нас

В течение четырех вечеров Первый национальный телеканал показывал телефильм "Майор Ветров", поставленный по мотивам нескольких романов Н.Чергинца.

На лесную поляну надо выходить тогда, когда на ней растут грибы, — так сформулировал перспективную задачу производства сериалов в середине 1990-х годов один из руководителей российского канала НТВ. Примерно тогда же Белорусский союз кинематографистов выступил с идеей совместной кинопродукции БТ и "Беларусьфильма". Ответ тогдашнего руководства ТВ гласил: нам это не нужно.

Ну что ж, вышли на лесную поляну, когда грибной запах выветрился и когда петух клюнул в то самое место. К этому времени число своих и совместных телеканалов выросло, а хорошая режиссура и драматургия — рассеялись. Было несколько сериальных проб киностудии, но постановочного опыта массового телекинозрелища по существу — нет. Раз нет своего опыта, откуда взяться культуре такого зрелища?

Что без сомнений удалось создателям "Майора Ветрова", так это рекламная кампания. Выставляю большой палец! В столичном метро с экранов призывно вглядывались в пассажиров сам майор Ветров и его недруги с приятными лицами. В "Комсомольской правде", "Рэспубліке", "Знамени юности" глаз схватывал цветные постеры в огненно-черных тонах. Само собой — рекламный ролик на Первом. Интервью средствам массовой информации одного из авторов сценария Николая Чергинца раздавались и до, и после показа. А встречи on line в Интернете из наших кинодеятелей еще не удостаивался никто. Вот что значит задействовать весь имеющийся ресурс! У многих складывалось ощущение: не посмотреть "Майора Ветрова" — значит, пропустить нечто важное в телепрограмме.

Словом, во всей партитуре чувствуется профессиональная рука, а профессионал в любом деле достоин уважения. И тут я вывела бы из-за кадра **Глеба Шпригова**. Он является не только одним из продюсеров и авторов сценария "Майора Ветрова", но и возглавляет компанию "БелПартнер ТВ". Эта негосударственная продюсерская и дистрибьютерская структура, действующая на территории страны, имеет удачные примеры не только содействия кинопроизводству и кинопрокату, но, что не менее важно, вполне приличный творческий результат. В частности, участие в создании короткого телесериала "На безымянной высоте", который режиссировал **Вячеслав Никифоров.** В случае с "Майором Ветровым" состоялось коммерческое и творческое взаимодействие с государственными ведомствами — Департаментом по кинематографии Министерства культуры Беларуси, к которому относится "Беларусьфильм", и Национальной государственной телерадиокомпанией Республики Беларусь. Партнерство вполне в духе времени, хоть и запоздалое со стороны госинстанций.

Каков же продукт на вкус? Один кинопроизводственник, с которым мы обменивались впечатлениями, иронично произнес: без пол-литра не разберешься. И стал просвещать насчет воинского устава и всяких деталей: приказ в армии — закон (а Ветров —ослушался), пуля из автомата может убить или ранить (а Ветрова она контузила), по следам Ветрова идет военная прокуратура, а судит его гражданский суд.

По поводу воинских параграфов (или авторского допущения) пусть дискутируют другие. В конце концов есть создатели и в титрах значится фамилия консультанта. Кинокритика должна интересовать более существенная вещь — соотношение коммерческой конъюнктуры и художественной состоятельности.

Глядя "Майора Ветрова", я вспоминала кинопродукцию американца **Менахема Голана**, выбравшего "Беларусьфильм" в середине 1990-х годов для изготовления детективно-слезливого киноширпотреба, ориентированного на третьи страны. Делал он его под устоявшимся на западе девизом: *"это пипл хавает"*. Не хочу сказать, что создатели "Майора Ветрова" следовали такому же лозунгу. Психологический опыт у нас другой, но опасность двинуться по схожим рельсам уже маячит. Профессионализм производственный, не подкрепленный художественной выверенностью, дает продукт по меньшей мере странный. Как винегрет с салатом оливье в одной тарелке. Конечно, любители и такого блюда найдутся, но на третий-четвертый раз даже нетребовательные потребители станут искать тарелки с другой едой. Благо выбор на белорусских телеканалах есть и будет расширяться.

Жанровая рецептура боевика предполагает не столько героя, сколько и.о.героя, то есть условного персонажа, действующего в рамках заданной авторами фабулы, очищенного от индивидуальной характеристики, от психологических нюансов. Но Ветров — нашенский (он — бывший афганец, патриот, долг чести приказывает ему не жалеть живота ради правого дела), посему без переживаний не обойтись. Отведен целый эпизод для скупых мужских слез (**Олег Штефанко**, надо отдать должное ему и режиссеру, сыграл переживательную сцену без туфты). Время от времени красавица Марина ищет успокоения на надежном плече Ветрова, поскольку тот... и.о. настоящего мужика. Не то что ее супруг, фармацевтический олигарх-истерик Конюхов или его приятель, от которого она принимает дорогой подарок. Впрочем, оказывается, Марина в докинематографической жизни была женой Ветрова, потом на наших глазах впуталась в темные дела, потом погибла от руки злодея, потом воскресла и опять стала женой Ветрова. Уф! Круче бывает, но у нас еще не было.

В интервью режиссера А.Лайе (Франскевича) читаем: *"... Пресса упорно вводила публику в заблуждение по поводу того, что мы снимаем. И теперь я начинаю испытывать легкий конфуз, потому что зрители будут ждать блокбастер с экшном, а это всего лишь психологическая драма с элементами боевика".*

Насчет обоих жанров сказано несколько самонадеянно (говорю не о намерении, а о результате).

Элементы — самое точное определение для данного телесериала. Когда нет цельной драматургии хорошего качества, начинаются экзерсисы-попурри. Боевые эпизоды и побеги-погоня сняты в фильме в сугубо реалистической манере. Действия персонажей лишены мотивировок, а значит, весьма условны. Есть эпизоды, намекающие на то, что со зрителем как бы играют. Например, вдруг на кухню антигероя (вечно жующего) Парамонова является злодей Хакким и шашлычным шампуром укладывает его на пол, а блондинка-сподвижница изящным жестом бросает розу на тело покойника. Вроде бы по-кинематографически вкусно, но отдает вставкой-дивертисментом из другого фильма. Или: вдруг как черт из табакерки в кадр вновь вскакивает... якобы труп Конюхова, супруга Марины. И все бы ничего, да только **Александр Песков** играет легкий гротеск, а Евгения Крюкова — серьезно-психологично. И сам эпизод близок к вставному концертному номеру. Жанровая эклектика (китчево-клиповая манера) уже давно имеет место в телекинопродукции. Но есть такое профессиональное понятие, как общий стиль фильма. Чтобы соединить жанр боевика, выросшего на чужой почве, с патриотическим фильмом советской закваски, нужны профессиональная чуткость, выработанный вкус и навыки. Иначе получится мешанина в духе маневров и мазурки, вызывающая совсем не тот эффект, на который рассчитывали создатели. Менять правила от эпизода к эпизоду — признак либо профессиональной спешки, либо слабое владение ремеслом.

Подытожим. Телекинопродукт — отечественный. Родословная — соцреалистический фильм с элементами американского боевика.

Сорт — второй, хотя реклама внушала, что высший.

Телекинобизнесу — да, эстетическому примитивизму — нет!

Алла БОБКОВА, кинокритик.

ВЫХОДНЫЕ ДАННЫЕ

Авторы сценария: **Николай Чергинец, Глеб Шпригов, Александр Зайцев**.

Режиссер: **Александр Лайе.**

Оператор: **Николай Ивасив.**

Продюсеры: **Александр Зимовский, Глеб Шпригов, Александр Ефремов**.

В ролях: Олег Штефанко, Мухтар Гусенгаджиев, Александр Песков, Евгения Крюкова, Владимир Янковский, Александр Подобед, Славик Степанян, Игорь Денисов, Светлана Зеленковская и другие.

Производство: **Белтелерадиокомпания, "Беларусьфильм", "АртСинема-групп", 2007 год.**

СВЕТСКАЯ ХРОНИКА

«Пророк» заставил похудеть Геннадия Давыдько

Многие знакомые и коллеги депутата Палаты представителей Национального собрания Геннадия Давыдько в последнее время заметили, что он сильно похудел. Хотя еще совсем недавно говорили другое: мол, уйдя с должности директора Купаловского театра Геннадий Брониславович набрал несколько килограммчиков из-за сидячей и малоподвижной депутатской работы в Овальном зале.

"Народная воля" решила поинтересоваться диетой Геннадия Давыдько. Однако Геннадий Брониславович сказал, что модные диеты и спорт тут ни при чем.

"Это все нервный стресс, который "дарит" работа", — сообщил Давыдько.

Дело в том, что Геннадий Брониславович — один из режиссеров мюзикла с рабочим названием "Пророк". И работа выжимает из него все соки.

В постановке питерского "Арт-центра" участвуют такие белорусские артисты, как **Светлана Зеленковская, Ядвига Поплавская и Александр Тиханович, Алексей Хлестов, Петр Елфимов.** Главную роль играет автор этого проекта **Илья Олейников.**

Кстати, премьера мюзикла в Минске запланирована на конец мая.

"Работа и активный образ жизни — самый лучший способ борьбы с лишними килограммами", — говорит Давыдько.

Екатерина АНДРЕЙЧЕНКО.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 САКАВІКА 2007 г.

ЗАКУЛІССЕ

Юдашкін не па кішэні Анжаліцы Агурбаш

Любімы куцюр'е Алы Пугачовай збіраецца адкрыць буцік у Мінску і не адмаўляецца стварыць сцэнічны касцюм на "Еўрабачанне" для Дзмітрыя Калдуна

Высокая мода становіцца бліжэй да беларусаў — адзін са сталічных клубаў распачаў праект, у рамках якога Мінск наведаюць славутыя куцюр'е сусветнага ўзроўню, зразумела, са сваімі калекцыямі. Першаадкрывальнікам у нас стаў Валянцін Юдашкін.

Ён апранае самых вядомых людзей постсавецкай прасторы, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі, народны мастак Расіі, лаўрэат нацыянальнай прэміі "Авацыя", член Акадэміі сацыяльных навук, ганаровы акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў, член-карэспандэнт самай прэстыжнай арганізацыі ў фэшн-свеце — Парыжскага сіндыката высокай моды, член Французскай палаты моды. Ужо больш за 10 гадоў ён кіруе сапраўднай імперыяй, імя якой — Дом моды Valentin Yudashkin".

На сустрэчу з журналістамі маэстра ад моды прыйшоў у цудоўным настроі. Бліскучыя стразы і вялікія чорныя акуляры — ужо можна браць на заметку, што зараз модна і актуальна. А яшчэ ўсмешка — адкрытая і вельмі абаяльная. Увогуле, склалася ўражанне, што любімы куцюр'е Пугачовай чалавек пазітыўны, шчыры і да таго ж з добрым пачуццём гумару. Нават не верылася, што так проста трымаецца дызайнер сусветнага ўзроўню.

— Калекцыю "Сады Санкт-Пецярбурга", якую я прывёз у Мінск, ужо ўбачылі ў Мілане, — расказвае Валянцін Юдашкін. — А Піцер атрымаў "Сады" на Дзень закаханых. Гэта быў мой падарунак гораду, які я вельмі люблю, куды наведваюся хаця б раз на месяц. Прыязджаю туды на цэлы дзень, каб абавязкова пахадзіць па музеях, падсілкаваць натхненне, бо менавіта ў іх знаходжу безліч цікавых ідэй. У Мінску я дэманструюся ўпершыню. Увогуле, даўно тут не быў — гадоў 20, але зараз ехаў на машыне і адразу пазнаў некаторыя месцы. У Беларусі ў мяне многа сяброў. А малодшы брат служыў тут — пад Барысавам, у танкавых войсках, да яго я часцяком прыязджаў.

— Якія мэты Вашага цяперашняга прыезду ў Мінск: творчыя ці хутчэй камерцыйныя?

— Не стану ўтойваць, следам за мною прыедуць мае менеджэры, якія дэталёва вывучаць і прааналізуюць беларускі рынак, такая своеасаблівая бізнес-разведка. Не выключаю, што ў Мінску можа з'явіцца буцік джынсавага адзення нашай маркі. Дарэчы, лінія Yudashkin Jeans вырабляецца ў Ганконгу, што дазваляе трымаць на яе адносна невысокія цэны. Напрыклад, пара джынсаў абыдзецца модніцам долараў у 120.

— А ўвогуле, колькі каштуе апрануцца "ад Юдашкіна"?

— Так павялося ў сусветнай практыцы, што модны дом запускае некалькі ліній. Valentin Yudashkin прытрымліваецца такой схемы:

Лінія "ад куцюр". Гэта эксклюзіўная вопратка, якую робім пад заказ, усяго каля ста мадэляў у год. Пра кошт тут і гаварыць не трэба, усё індывідуальна, але гэта вельмі дорага.

Першая лінія гатовага адзення вырабляецца ў Італіі. Цэны на яе стартуюць з 1500 долараў.

Другая лінія — джынсавая, Valentin Yudashkin Jeans. І яе мы шыем у Італіі.

Трэцяя лінія, таксама джынсавая, гэта больш бюджэтны варыянт пад назвай Yudashkin Jeans, як я ўжо казаў, робім яе ў Ганконгу. Зразумела, што гэтая лінія найбольш масавая і карыстаецца самым шырокім попытам.

Ужо даўно мой Дом моды займаецца аксесуарамі, а ў красавіку асвоім новы накірунак — гадзіннікі. Тут будзе многа дыяментаў, матывы рэптылій. Прэзентацыя гадзіннікаў ад Юдашкіна адбудзецца ў Швейцарыі, краіне, якая па праву лічыцца заканадаўцай якасці і моды гэтай галіны.

— Валянцін, калі не сакрэт, хто Вашы кліенты? Хто з палітыкаў, дзеячаў культуры, шоубізнесу апранаецца ў Вас?

— Апранаць палітыкаў — справа няўдзячная. Прадстаўніц прыгожай паловы ў нашым кіраўніцтве не так і шмат, а я больш зарыентаваны на жаночыя мадэлі, мая муза — гэта мая сям'я, такі зборны вобраз: мама, жонка, дачка — жанчыны, якія мяне ахоўваюць і дапамагаюць мне. У бамондзе ж маіх кліентаў нямала. Многія з іх — мае сапраўдныя сябры. Вось калі ляцеў у Мінск, у аэрапорце сустрэў Баскава і Галкіна. Часу было мала, але хоць крыху ўдалося пагаварыць. Апранаць зорак мне падабаецца — можна сапраўды пафантазіраваць. У мяне нават ёсць свае любімчыкі!

— Адну з іх мы дакладна ведаем! У Беларусі добра памятаюць, прынамсі, адну Вашу сукенку — тую, што Вы шылі на "Еўрабачанне" для Анжалікі Агурбаш.

— Па-першае, гэта было сапраўды цікава. І я на самай справе быў рады займацца распрацоўкай такога касцюма — нестандартная праца, сукенка-трансформер. А па-другое, гэта была асабістая просьба Філіпа Кіркорава, якому я проста не магу адмовіць, бо ён сапраўдны сябра нашай сям'і.

— Валянцін, а чаму Анжаліка больш з Вамі не супрацоўнічае? Днямі завяршыўся яе гастрольны тур па Беларусі, у час якога спявачка падкрэслівала, што яе сцэнічныя строі ад моднага зараз дызайнера Алішэра.

— Думаю, таму што ў мяне дорага. (*Смяецца.* — **Аўт.**)

— Здаецца, Вас чакае яшчэ адна асабістая просьба Філіпа Кіркорава — новы пратэжэ Вашага сябра Дзмітрый Калдун таксама збіраецца на "Еўрабачанне"...

— Я не супраць. Пакуль пагаварыць асабліва часу не было, толькі па тэлефоне, але хутка абавязкова абмяркуем гэтае пытанне з Філіпам больш грунтоўна і дэталёва.

— А што Вы думаеце пра беларускіх дызайнераў?

— Прабачце, але я нікога з іх не ведаю. Адзінае, што прыходзіць на памяць, гэта ваша фабрыка бялізны "Мілавіца".

Пад шыльдай майго Дома моды працуе школа, дзе мы рыхтуем асістэнтаў. Зараз у нас навучаецца 15 чалавек, але сярод іх няма вашых землякоў. А ўвогуле я з калегамі выкладаю ў Італіі, Японіі, зараз займаемся тым, каб стварыць сваю школу і ў Нью-Йорку.

— Валянцін, толькі зараз крыху сціхлі дыскусіі наконт памераў мадэляў. Якая Ваша пазіцыя ў гэтым пытанні? Якіх габарытаў мы будзем бачыць мадэляў на Вашых паказах?

— Поўныя мадэлі — гэта не навінка на подыумах. З гэтым даўно эксперыментавалі і на Захадзе, і я не адставаў. Калі памятаеце, некаторы час я супрацоўнічаў з Надзеяй Бабкінай, хаця яна ніколі не адпавядала мадэльным стандартам. Адзенне для паказаў шыецца так званага "базавага" памеру, гэта 40—41. Зразумела, што большасць кліентаў такімі не будуць. Проста гэты памер зручна павялічыць і размножыць.

— Не зусім культурна заглядваць у чужую кішэню, але кажуць, што Вы — мільянер. Не адкрыеце сакрэт, сапраўды фэшн-індустрыя такая прыбытковая?

— Як і ў любой справе, а асабліва ў мастацтве, у свеце моды працуюць сотні і тысячы творцаў, але сапраўднага поспеху, у тым ліку і фінансавага, дасягаюць адзінкі. Тут мне сапраўды пашчасціла: я займаюся любімай справай, атрымліваю ад яе асалоду і на самай справе я зусім не бедны чалавек. Па прагнозах, праз 4 гады мая кампанія павінна выйсці на сусветную біржу. У мяне была ўстаноўка — не здрадзіць той прафесіі, якую я абраў. У свой час я мог заняцца і нафтай, і газам, на тое была і дастатковая адукацыя, і пэўная магчымасць, але я застаўся верным прыгажосці, ніколі аб гэтым не пашкадаваў. Зараз я задаволены сваёй справай ва ўсіх сэнсах.

Таццяна ПАЎЛІКАВА.



МОДНІЦАМ НА ЗАЎВАГУ

Некалькі парад ад Валянціна Юдашкіна

Як сцвярджае расійскі куцюр'е, у сезоне вясна-лета —2007 модны стыль дзевяностых. Гэта рамантыка, вялікія свабодныя формы. У аснове сілуэтнай лініі акцэнтаванае плячо (вяртаюцца падплечнікі), заніжаная пройма, падкрэсленая талія, мяккія формы жакетаў без падкладкі, вялікія драпіраваныя блузы. У новай калекцыі мадэльера пануюць белыя, малочныя, бэжавыя, лімонныя, светла-бірузовыя колеры, акцэнты робяцца аранжава-чырвоныя. Сярод тканін перавага аддаецца шоўку — усім яго гатункам і відам. У гэтым сезоне дэкор адрозніваецца падкрэсленай маляўнічасцю і лёгкасцю спалучэння вышыўкі і аплікацыі.

Паўсядзённае адзенне пабудавана на мяккіх формах, шматслойных дэталях, спалучэнні лёгкіх тканін розных фактур. Шаўковыя паясы, якія падкрэсляць талію, завершаць вобраз. Вячэрнія сукенкі максімальна жаноцкага сілуэту. Камплектуюцца з шаўковымі жакетамі. Драпіроўкі з шматслойных паўпразрыстых шыфонаў ствараюць складаныя каляровыя спалучэнні, іх дапаўняюць вышыўка, стразы і шклярус у тон.

Лёгкі летні кашамір і яго кампазіцыі з шоўкам у трыкатажных топах спалучаюцца з баваўнянымі штанамі і джынсамі, абавязкова з высокай таліяй. Для халаднаватых дзён і вечаровых выхадаў — кароткія паліто-плашчы з шаўковай тафты, а таксама баваўняныя са льном.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

Аліменты плаціць трэба...

Мая былая жонка з'ехала на пастаяннае месца жыхарства ў іншую краіну разам з маім непаўналетнім сынам. Аліменты на сына з мяне ўтрымліваюцца і пералічваюцца на банкаўскі рахунак у Рэспубліцы Беларусь. Ці правамочна ўтрыманне з мяне аліментаў у такой сітуацыі?

Яўген ЛАТЫШОЎ, Мінск.

— Кодэксам аб шлюбе і сям'і замацаваны абавязак бацькоў па ўтрыманні сваіх непаўналетніх дзяцей і недзеяздольных паўналетніх дзяцей, якім патрэбна дапамога. Ніякіх геаграфічных абмежаванняў у гэтым сэнсе няма.

Дарэчы, у выпадку, калі бацькі гэтага не робяць, аліменты на ўтрыманне дзяцей бяруцца з бацькоў у судовым парадку. А за ўхіленне бацькоў ад аліментаў у Рэспубліцы Беларусь прадугледжана крымінальная адказнасць.

У ЛПП — толькі праз суд

Мне падказалі, што адзіны спосаб, з дапамогай якога я магу супакоіць мужа-алкаголіка, — гэта накіраваць яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Як гэта правільна зрабіць?

Святлана КАРНЕЕВА, Брэсцкая вобласць.

— У адпаведнасці з існуючым заканадаўствам, прымусовая ізаляцыя ў лячэбна-працоўны прафілакторый магчыма толькі па рашэнні суда. І пры ўмове, што чалавек, які туды накіроўваецца, пакутуе на хранічны алкагалізм, а яго паводзіны, нягледзячы на папярэджанні з боку праваахоўных органаў, у лепшы бок не змяніліся. Дыягназ "хранічны алкагалізм" усталёўваецца ў адпаведных установах аховы здароўя камісіяй, якая складаецца з урачоў-псіхіятраў ці нарколагаў. У гэтыя ўстановы на падставе пастановы органаў унутраных спраў трапляюць асобы, якія ў п'яным стане неаднаразова парушалі грамадскі парадак ці правы грамадзян. У лячэбна-працоўных прафілакторыях медыка-сацыяльная рэадаптацыя з абавязковым прыцягненнем да працы цягнецца год-паўтара. За дадатковай інфармацыяй вы можаце звярнуцца да свайго ўчасковага інспектара. Але памятайце, калі вы раней не выклікалі міліцыю і нікуды не звярталіся па дапамогу ў барацьбе з п'янствам мужа, то ў ЛПП яго не накіруюць.

Падатак з выйгрышаў не бяруць

Падкажыце, калі ласка, ці бярэцца падатак з выйгрышаў у латарэях "Ваша лато", "Суперлато" і іншых?

І.В.КУЗНЯЦОВА, Мінск.

— На сённяшні дзень у Беларусі існуюць наступныя віды латарэй: грашова-рэчавыя, лічбавыя, імгненныя. Удзел грамадзян у латарэі з'яўляецца іх свабодным волевыяўленнем, таму вас ніхто не можа прымусіць купляць латарэі. А вось выйгрышы падаткам не абкладаюцца. Іх таксама не трэба ўказваць у дэкларацыі аб даходах.

Пра іншагародніх паручыцеляў

Мы маладая сям'я. Пад будаўніцтва кватэры ў сталіцы атрымліваем ільготны крэдыт. У банку нам сказалі, што паручыцелі павінны быць з Мінска. Хаця нашы сваякі, гатовыя быць паручыцелямі, пражываюць у іншым населеным пункце краіны. Падкажыце, ці можа грамадзянін Беларусі, не мінчанін, з'яўляцца паручыцелем у нашай сітуацыі?

Ігар МАКАРЭВІЧ, Мінск.

— У якасці паручыцеляў могуць выступаць грамадзяне, якія не пражываюць у населеным пункце па месцы жыхарства крэдытаатрымальніка. Заканадаўствам не ўстаноўлена ніякіх абмежаванняў, якія датычацца абавязковасці пражывання крэдытаатрымальніка і яго паручыцеляў у адным населеным пункце.

Каб абараніць спажывецкія правы...

У краме радыётэхнікі я паўгода таму набыў відэамагнітафон. На яго распаўсюджвалася трохгадовая гарантыя. Але праз шэсць месяцаў ён зламаўся. У рамонт па гарантыі яго ўзяць адмовіліся, сказаўшы, што відэамагнітафон "біты". Гэта не так, па крайняй меры ў мяне ён не падаў. Падкажыце, куды я магу звярнуцца, каб абараніць свае правы?

Яўген ДРОБЫШАЎ, Мінск.

— Першы крок, які вы можаце зрабіць, звярнуцца ў "Грамадства абароны правоў пакупнікоў". Арганізацыя знаходзіцца ў Мінску на вул. Чырвонай, 15 у офісе №40. Кантактны тэлефон **284-39-34.** Там вам падкажуць, што і як рабіць далей.

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34-А, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.



ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Нам нельга разлучацца!

Сапраўды, каб дабіцца лепшага жыцця, каб выратаваць Беларусь, нам нельга разлучацца!

Хто не зрабіў **перадаплату** за нумары II квартала — не спазніцеся.

Агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём нарадзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, у чарговы раз друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа		Дата	Сумма
Предоплата за март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)			
Плательщик		Пеня	
		Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа		Дата	Сумма
Предоплата за март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)			
Плательщик		Пеня	
		Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами и обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

І ТАК БЫВАЕ

Хваткі госць

Незвычайнае злачынства раскрылі супрацоўнікі Лідскага аддзела аховы.

Паводле інфармацыі УУС Гродзенскага аблвыканкама, у мінулыя выхадныя ў рэстаране "Дзітва" на месцы злачынства быў затрыманы адзін з гасцей, запрошаных на вясельную ўрачыстасць. Калі вяселле было ў поўным разгары, мужчына пракраўся на склад установы і ўкраў адтуль 600 тысяч рублёў, блок цыгарэт, пляшку каньяку і прадукты харчавання. Сума ўрону склала каля мільёна рублёў.

У дачыненні да затрыманага следчым аддзелам Лідскага РАУС распачата крымінальная справа.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 14.03.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №